Ігар Пракаповіч

НАЗВЫ НАШЫХ ВЁСАК

Паставы, 2013



Пастаўская раённая арганізацыя
Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

Пракаповіч І.,
Назвы нашых вёсак / Ігар Пракаповіч. - Паставы, ТБМ імя Ф. Скарыны, 2013. - 100 с.

*Аўтар удзячны за парады і дапамогу пры падрыхтоўцы матэрыялаў дактаранту Інстытута літоўскай мовы, выкладчыку Віленскага педагагічнага ўніверсітэта **Алесю Адамковічу** і супрацоўніцы бібліятэкі ў Рокішках **Надзеі Івановай.***

Кніга ўяўляе сабой айканімічны слоўнік: у алфавітным парадку падаюцца варыянты сэнсавага значэння і паходжання 480 назваў населеных пунктаў Пастаўскага раёна. Гэта першае выданне па тапаніміі гарадскіх паселішчаў і вёсак паўночна-заходняга рэгіёна Беларусі.

Кніга будзе карысная ўсім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай роднага краю.

НАЗВЫ НАШЫХ ВЁСАК

Айканімічны слоўнік Пастаўскага раёна

А

Абрам*о*ўшчына – вёска за 27 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8,5 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў за 1 км на захад ад возера Саранчаны. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета як маёнтак Антановіча. Назва паходзіць ад прозвішча *Абрамаў*, якое ўтварылася ад уласнага імя *Абрам* – формы кананічнага праваслаўнага *Авраам, Авраамий,* каталіцкага польскага *Abraham*, што азначае "*бацька шматлікіх народаў*" Фармант "-шчына" сведчыць пра тое, што першапачаткова назва абазначала мясцовасць, а потым перайшла на паселішча. Ад гэтага імя на Пастаўшчыне ўтварыліся прозвішчы *Абрамаў, Абраменкоў, Абрамовіч, Аўрамаў, Аўраменка, Аўрамчук.*

Агар*о*днікі – вёска за 12 км на поўдзень ад Паставаў каля шашы Вільня-Полацк. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Хлявінскай. Назва паходзіць ад гістарычнага тэрміна "*агароднік*" – так называлі сялян у ВКЛ, якіх сялілі на невялікіх дзялянках і абавязвалі выконваць пэўныя правіннасці. Паводле "Уставы на валокі" 1557 года агароднікам давалі па 3 маргі (1 морг – 0,71 га) зямлі і ссялялі ў вёскі па 10-20 двароў паблізу фальваркаў. Гэта акалічнасць дазваляе выказаць меркаванне аб тым, што вёска ўтварылася ў XVI стагоддзі, бо ў суседняй вёсцы Манькавічы маёнтак вядомы якраз з гэтага часу. Агароднікі – радзіма вядомага беларускага паэта Уладзіміра Дубоўкі.

Адам*о*ва – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на поўдзень ад Варапаева. Вядома як засценак у Лучайскай воласці Вілейскага павета з 1905 года. Назва паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *Адам*, што на іўрыце азначае "чалавек". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Адамчык, Адамовіч.*

Аж*а*рава – вёска за 14 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 1 км на поўнач ад Груздава. Вядома з 1873

года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Назва, верагодна, утворана ад асновы "*жар*" у значэнні "*гарэлы лес*", "*лясны пажар*". Магчыма паходжанне назвы ад імя Ажар.

Аж*а*рцы – вёска за 13 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Назва ўтворана ад асновы "*жар*" у значэнні "*гарэлы лес*", "*лясны пажар*". Тэрмін "жар" характэрны для падсечна-агнявога земляробства ў заходняй Беларусі. Ажарцамі называлі невялікія выпаленыя ўчасткі лесу і паселішчы, якія ўзнікалі на гэтых месцах.

Аж*у*ны – вёска за 23 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на поўдзень ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета як уладанне Соф'і Мастоўскай. Паходжанне назвы канчаткова не высветлена. Як варыянт, можна прапанаваць растлумачыць яе ўтварэнне з балцкіх моў, дзе літоўскае "azuolas" азначае "дуб". Сустракаецца і літоўскае прозвішча Ажыунас.

Ажур*о*йсці – вёска за 34,5 км на захад ад Паставаў, за 4,5 км на поўдзень ад Лынтупаў каля вытокаў ракі Лынтупка. Назва мае балцкія карані і складаецца з дзвюх частак: у літоўскай мове "*azu*" азначае "*за*", а "*raistas*" – "*забалочаны лясок*". Такім чынам, назва вёскі ўказвае яе месцазнаходжанне "*за забалочаным ляском*".

Азёркі – вёска за 4 км на поўнач ад Паставаў каля возера Азёркі. У пачатку ХХ стагоддзя ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета была засценкам – уладаннем Пшаздзецкіх. Назва паходзіць са славянскіх моў, хоць падобная аснова сустракаецца і ў суседніх балтаў: літоўскае "*ezeras*", латышскае "*ezers*" – "*возера*". Першапачаткова яна азначала мясцовасць з групай невялікіх па плошчы азёр, якія сапраўды маляўніча раскінуліся на поўнач ад Паставаў, а пазней перайшла і на вёску.

Ак*е*лы – вёска за 20 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на поўдзень ад Камаяў, за 1 км на поўнач ад возера В. Швакшты. Назва паходзіць ад старажытнага імя *Акіла (Акула)*, што азначае "*арол*". У цяперашні час на

Пастаўшчыне сустракаецца прозвішчы *Акелан, Акулаў*.

Ал*а*шкаўшчына – вёска за 25 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 7 км на захад ад Белек на правым беразе ракі Дзісна. Вядома з XIX стагоддзя. Назва паходзіць з фіна-ўгорскіх моў. У фінскай мове "*ala*" – "тэрыторыя", "*alanko*" – "нізіна"; у эстонскай "*alang*" – таксама "нізіна". Асновы з падобным значэннем сустракаюцца ў вепскай, карэльскай, марыйскай мовах. Тлумачэнне сэнсу назвы добра стасуецца з геаграфічнымі асаблівасцямі вёскі: яна месціцца на Полацкай нізіне ў даліне ракі Дзісна. Фармант "-шчына" сведчыць пра тое, што першапачаткова назва абазначала мясцовасць.

Ал*е*шына – вёска за 23,5 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Варапаева. Вядома з 1861 года як маёнтак у Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва з'яўляецца тыпова славянскай. У беларускай мове "*алешына*" - гэта "*вольха*". Наяўнасць альховых зараснікаў нарадзіла адпаведную назву мясцовасці, а пазней – і вёскі.

Аліхв*е*ры – вёска за 26 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 9 км на поўнач ад Варапаева на паўднёвым беразе возера Трумпічы. Вядома з 1873 года як уласнасць Тызенгаўзаў. Назва патранімічная, утворана ад царкоўнаславянскага імя *Елівферый*, якое прайшло шэраг трансфармацый у рускай (*Алифер*) і беларускай (*Альфер, Аліхвер*) мовах. Заўважым, што ў беларускай мове адносна часта сустракаецца пераход "ф" у "хв", што і зафіксавана ў назве. На Пастаўшчыне прозвішчы *Аліхвер, Альфер* з'яўляюцца даволі распаўсюджанымі.

Аляхн*і*шкі – вёска за 12 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Належала Мілеўскім. Назва паходзіць ад імя *Аляхно* – формы кананічнага хрысціянскага *Аляксей*, што значыць "*абаронца*". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Аляхновіч, Алешка, Аляшкевіч*.

Андр*о*ны – вёска за 15 км на паўночны ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Паловіца. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Назва паходзіць ад імя Андрон, якое з'яўляецца ўсечанай формай поўнага імя *Андранік,* што значыць

"пераможца мужоў". Ужывалася ў размоўна-побытавой сферы як зварот да людзей сярэдняга ці старэйшага ўзросту. Прозвішча *Андрон* зараз шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне; сустракаюцца таксама *Андронаў, Андрановіч*.

Андрушышкі – вёска за 21 км на захад ад Паставаў, за 12 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў, за 1 км на захад ад возера В. Сурвілішкі. Вядома з пачатку XX стагоддзя як засценак у Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, які належаў Даўгялам. Назва патранімічная, паходзіць ад імя *Андруша* – формы кананічнага хрысціянскага *Андрэй,* што значыць *"мужны, храбры"*. З асновай "Андруш-" на Пастаўшчыне сустракаецца шэраг прозвішчаў: *Андрушкевіч, Андрушка, Андрушчанка.*

Анкуды (1) – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева; вядома з 1873 года ў маёнтку Руцкое Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Длужнеўскім. Назва патранімічная, паходзіць ад імя або мянушкі *Анкуд*, пра што сведчаць прозвішчы *Анкуд, Анкудовіч*, якія даволі часта сустракаюцца на Пастаўшчыне. Само імя (мянушка) неславянскае, прыйшло да нас верагодна з фіна-ўгорскіх моў, дзе "*куд*" – "*жытло*", "*шалаш*", "*хата*", а "*ан*", верагодна, прыстаўка адмаўлення. Такім чынам, можна рэстаўраваць старажытнае імя: *Анкуд -* значыць, "*бяздомны*", "*які не мае жытла*".

Анкуды (2) – вёска за 28 км на ўсход ад Паставаў, за 5,5 км на ўсход ад Варапаева. У пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Тлумачэнне гл. *Анкуды (1).*

Апідамы – вёска за 28 км на захад ад Паставаў, за 9 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Адназначнага тлумачэння паходжання назвы не існуе. Як варыянт, можна звязаць яе ўтварэнне са старажытнагрэчаскім імем *Апід*. Тапаністы звязваюць назву вёскі з лацінскім "*апід*" – "*пчала*".

Асінагарадок – вёска за 36 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Навадруцк. Вядома з 1567

года як маёнтак Жабаў, пазней – Друцкіх-Любецкіх. Назва складаецца з дзвюх частак: "*асіна*" – назва дрэва і "*гарадок*" – старажытнае ўмацаванае паселішча. Сапраўды, у вёсцы знаходзіцца высокая гара – гарадзішча, а паводле легенды, у сярэднявеччы на асіне з'явіўся абраз Маці Божай, у гонар чаго і была пабудавана на гары царква.

Ас*і*ннікі – вёска за 27 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 6 км на захад ад станцыі Полава. Вядома з 1873 года як засценак, які належаў Тызенгаўзам. Назва ўтварылася ад пароды дрэва "*асіна*" і спачатку адносілася да ўрочышча, а пазней перайшла на вёску.

Аўл*а*сы – вёска за 3 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 0,5 км на ўсход ад ракі Спарыца. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета як засценак. Назва паходзіць ад царкоўнаславянскага імя *Уласій (Власий*) – "*невук*", якое ў беларускай мове змянілася на *Аўлас*.

Паводле меркавання лінгвіста І. Яшкіна, назва можа паходзіць і ад дыялектнага "аўлус" – фальварак без жыхароў, які належаў да якога-небудзь маёнтка; незаконна адаранае поле; дармавая маёмасць.

Зараз на Пастаўшчыне даволі шырока сустракаюцца прозвішчы *Аўлас, Аўласевіч.*

Б

Багдан*о*ва – вёска за 12 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўночны захад ад возера Лучай. Вядома з пачатку XX стагоддзя як засценак, які належыў барону Клейгісу. Назва паходзіць ад імя *Багдан*, якое ў XVI-XVII стагоддзях адносілася да паганскіх імён, а пазней было прынята хрысціянскай царквой. Імя перакладаецца як "*Богам дадзены*", "*Пасланец Бога*". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Багдан, Багданаў, Багданёнак, Багдановіч.*

Багдз*ю*ны – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Гадуцішкі. Назва, верагодна, паходзіць ад мясцовай формы імя *Багдан* – "*Багдзя*", адкуль і атрымліваецца лагічны рад: Багдан – Багдзя – Багдзюн – Багдзюны.

Б*а*кавічы – вёска за 7 км на ўсход ад Паставаў на

левым беразе ракі Лучайка. Вядома з XVII стагоддзя як уладанне Зяновічаў. Пазней належала Тызенгаўзам. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад царкоўнаславянскага імя *Аввакум*, якое ў беларускай мове набыло форму *Абакум*, з якой у сваю чаргу ўтварыліся больш спрошчаныя *Бак, Бака, Бакан*. Імя стала асновай прозвішчаў *Бакавіч, Бакуновіч, Бакула*, якія зараз сустракаюцца на Пастаўшчыне.

Бала*і* – вёска за 28 км на паўночны ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Паловіца. Вядома па крыніцах з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва ўтварылася ад балцкай асновы "*bala*" у значэнні *"балота", "мокрае месца"*. Сапраўды, вёска знаходзіцца сярод балот Дзісненскай нізіны. Ад назвы вёскі ўтварылася прозвішча *Балай*, якое шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Магчымае паходжанне назвы з татарскай мовы, у якой "бала" азначае "дзіця", а "-ай" – памяншальны суфікс. Такую прозвішча-мянушку мог мець хтосьці з першажыхароў вёскі.

Барав*о***е** – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева на беразе возера Баравое. Назву атрымала ад наймення маляўнічага возера, якое раскінулася сярод вялікага ляснога масіву - *бору*.

Барадзін*о* – вёска за 16 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. У крыніцах сустракаецца з канца XVIII стагоддзя. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскага "*бара*", "*бар*", што азначае "вільготнае месца паміж узгоркамі; балота". У польскай мове "*barzina*" – "балота". Існуе легенда, што назву вёсцы даў нейкі памешчык ў памяць пра бітву паміж рускімі і французскімі войскамі каля вёскі Барадзіно пад Масквой у 1812 годзе.

Бар*а***навічы** – вёска за 6 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на левым беразе ракі Лучайка. У 1715 годзе мела назву Баранаў, належала Тызенгаўзам. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі паходзіць ад прозвішча "*Баранаў*", якое

ўтварылася ад паганскага імя-мянушкі *Баран*. На Пастаўшчыне шырока распаўсюджаны прозвішчы *Баранаў, Баранскі, Бараноўскі*.

Бараўк*і* – вёска за 10 км на поўнач ад Паставаў каля ракі Лучайка. У крыніцах сустракаецца з пачатку XX стагоддзя. Назва паходзіць ад прозвішча *Бароўка*, якое ўтворана ад славянскай асновы "*бор*" у значэнні "*сухі хвойны лес*". Прозвішча *Бароўка* – адно з самых распаўсюджаных на Пастаўшчыне. Таксама сустракаюцца *Баравік, Баравы, Баравікоў, Баравінскі, Бароўскі, Бароўскіх.*

Барс*у***чы Мох** – вёска за 12 км на паўночны ўсход ад Паставаў. Знаходзіцца ў лясным забалочаным масіве Варапаеўская Дача. Спачатку назва адносілася да ўрочышча, а пазней перайшла на вёску.

Бар*э***йкі** – вёска за 43 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 11 км на поўнач ад Варапаева на левым беразе ракі Галбяіца. Вядома па крыніцах з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Барэйка*, якое прыйшло з балцкіх моў, дзе "*baras*" – "*вялікі лес*".

Бацьв*і***навічы** – вёска за 25 км на поўдзень ад Паставаў. Вядома з першай паловы XX стагоддзя. Назва, верагодна, паходзіць ад царкоўнаславянскага імя *Варфаламей (Баўтрамей)*, якое ў будзённым жыцці прайшло шэраг змяненняў. Яны маглі выглядаць наступным чынам: Баўтрамей – Баўтрук – Бат – Бацвін. На магчымасць такіх трансфармацый указвае наяўнасць славянскіх прозвішчаў Бацвінаў, Бацвіннік, Бацвілоўскі. Але такія прозвішчы на Пастаўшчыне не сустракаюцца, і гэта зніжае вартасць прапанаванай версіі. Можна зрабіць дапушчэнне, што *Бат, Бацвін* – гэта імёны паганскія і ў пазнейшы час не ўжываліся. Як версію можна прапанаваць паходжанне назвы ад славянскіх слоў *"батва", "бацвінне"* у сэнсе "густая раслліннасць".

Ба*я***ры** – вёска за 36 км на паўднёвы захад ад Паставаў каля возера Вялікія Швакшты. У крыніцах згадваецца ў пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад гістарычнага

тэрміна “*баяры*” – “радавітыя дваране, буйныя памешчыкі”.

Б*е*лае – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўночны ўсход ад Варапаева. Вядома ў крыніцах з пачатку XX стагоддзя у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Вёска знаходзіцца на беразе возера *Белае*, ад якога і атрымала назву. Найменне возера адлюстроўвае колер вады ў вадаёме.

Б*е*лішкі – вёска за 46 км на захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Лынтупаў. Вядома з канца XIX стагоддзя як уладанне Бішэўскага ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Утваральнай асновай назвы маглі стаць як балцкія, так і славянскія тэрміны. У латышскай мове “*beluté*” – “яма з вадой”, “лужына”; у беларускай “*бель*” – “балота з беразняком”, “невялікае балота”, “забалочанае нізкае месца”. Вёска сапраўды знаходзіцца каля балота. У Пастаўскім раёне такую ж тапанімічную аснову маюць вёскі *Белькі і Бялянішкі*.

Б*е*лькі – вёска за 45 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Полава. Вядома па крыніцах з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Тлумачэнне назвы: гл. *Белішкі*.

Бержал*а*ты – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 12 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў на мяжы з Літвой. Назва паходзіць з балцкіх моў, дзе літоўскае “*berzelis*” – “бярозка”,“*berzalotas*”-”беразняк”.

Б*і*рвіта – вёска за 19 км на поўнач ад Паставаў каля сутокаў рэк Мядзелка і Бірвіта. У пачатку XX стагоддзя – фальварак Пшаздзецкіх у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі паходзіць ад наймення ракі. Тлумачэнне назвы знаходзім у тунгуска–маньчжурскім і фіна–вугорскіх мовах: “*біра*”- рака (эвенк., эвен.), “*віт*” – “вада” (мансі). Прыблізнае значэнне назвы – “многаводная рака”. Раней яно, магчыма і было так. Беларуская “Бірвета” мае тапанімічную радню ў далёкім Забайкаллі: р.В.Біра і М.Біра – прытокі Амура, заліў Бірая на Байкале, г.Бірабіджан – сталіца Яўрэйскай АВ РФ і г.д. Ёсць “радня” і па-суседству: возера

Бірутэ ў Браслаўскім раёне.

Біюці – вёска за 15,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Груздава. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць з балцкіх моў, дзе літоўскае "*bijoti*" – "баяцца". Адсюль "*біюць*" – "баязлівы чалавек".

Боцвіны – вёска за 6 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Тлумачэнне назвы: гл. *Бацьвінавічы*.

Буда – вёска за 32 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 12 км на паўночны ўсход ад Варапаева каля сажалак рыбхозу "Навінкі". Назва з'яўляецца гістарычным тэрмінам, які адлюстроўвае гаспадарчую дзейнасць людзей: "*буда*" – гэта "месца, дзе выпальваўся поташ", "поташны завод". Вёска знаходзіцца ў лясным масіве і, напэўна, ўзнікла на месцы невялікага заводзіка.

Будзева – вёска за 5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад тэрміна "*буда*" – "поташны завод". Па гістарычных звестках, у маёнтку Паставы ў XVIII-XIX стагоддзях сярод іншай прадукцыі вырабляўся поташ. Вельмі верагодна, што завод знаходзіўся ў Будзеве.

Бульбунава – вёска за 15 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 0,5 км на паўночны ўсход ад возера Бульбінаўскае. Назва паходзіць ад прозвішча *Бульбенаў*, якое сустракаецца на Пастаўшчыне.

Буцавічы – вёска за 13 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3 км на ўсход ад Камаяў. Вядома з 1873 года як уладанне Суліструўскіх у Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Буцавіч*, утворанага, верагодна, ад старажытнаславянскага імя *Будзімір*, якое ўжывалася ў спрошчаных формах *Бут, Буц, Будзька*. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Будзіч, Буднікаў, Будзько, Будзянскі*.

Бучалішкі – вёска за 6 км на паўночны захад ад

Паставаў каля мяжы з Літвой. У аснове назвы ляжыць старажытны славянскі тэрмін “*бучала” (“бучыла”)* у сэнсе “гразкае, топкае балота”, “дрыгва”, “яма з вадой”. Пад балцкім уплывам назва набыла літоўскі канчатак. У Пастаўскім раёне шырока распаўсюджана прозвішча *Бучэль*, якое магло даць назву вёсцы.

Бяд*у*нкі – вёска за 17 км на паўднёвы захад ад Паставаў за 5 км на ўсход ад возера В. Швакшты. У крыніцах згадваецца ў пачатку XX стагоддзя. Назва адлюстроўвае гаротны стан вясковых жыхароў.

Бял*я*нішкі – вёска за 37 км на захад ад Паставаў, за 9 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У канцы XIX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, уваходзіла ў маёнтак Пад’ельнякі і належала Здзяхоўскім. Тлумачэнне назвы: гл. *Белішкі*.

Бян*а*паль – вёска за 9 км на захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Камаяў. Назва складаецца з двух частак. Першая, “бяна-”, уяўляе сабой скажонае імя *Беня* – форму кананічнага хрысціянскага *Бенедыкт (Банэдык)*. Другая частка азначае “*поле*”. Вёска вырасла на месцы “Бенедыктава поля”.

В

Вайцях*і* – вёска за 28 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 11 км на поўнач ад Варапаева паміж возерам Трумпічы і ракой Галбяіцай. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага імя *Войцех*, якое асабліва распаўсюджана ў палякаў. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Вайцяшонак, Вайцяхоўскі*.

Вайшкіл*о*г – вёска за 30 км на захад ад Паставаў, за 5 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва складаецца з двух частак: літоўскага імя *Vaisys, Vaisa* і асновы “*лог*” у значэнні “даліна”, “шырокая нізіна”. Узнікла як назва мясцовасці, якая належыла Вайшку.

Вайшк*у*ны – вёска за 30 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў каля возера Балдук (Блакітныя азёры). Вядома з 1873 года ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць

ад літоўскага імя *Вайшыс, Вайша, Вайшкун (Vaisys, Vaisa).* Як варыянт можа разглядацца паходжанне назвы ад літоўскага *"vaikaitis"* – унук.

Вал*о*дзькі – вёска за 8 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. Назва паходзіць ад імя *Валодзька* – формы старажытнаславянскага імя *Уладзімір*, што азначае "*ўладар свету*". Прозвішча *Валадзько* шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Вал*о*жына 1-е – вёска за 15 км на паўночны ўсход ад Паставаў каля Валожынскага возера. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва мае славянскае паходжанне. У беларускай мове "*валога*" – "вільготнае дрыгвістае месца". Сапраўды, каля вёскі знаходзяцца вялікія балоты з азёрамі, на якіх вядзецца здабыча торфу.

Вал*о*жына 2-е – вёска за 16 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад вёскі Валожына 1-е. Тлумачэнне назвы: гл. *Валожына 1-е*.

Баран*о*ўка – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Навадруцк. Назва мае ў аснове фіна-ўгорскі корань *"вар" ("ор")* са значэннем "глыбокі яр", "лагчына". Геаграфічна вёска ляжыць у паніжэнні паміж значнымі ўзвышшамі. Пацвярджэннем такой версіі можа быць і тэрмін з рускай мовы *"воронка"* – "паглыбленне", "упадзіна", які, верагодна, таксама ўтварыўся ад той жа угра-фінскай асновы. Верагодна, першапачаткова назва адносілася да ручая.

Баран*о*ўшчына – вёска за 7 км на паўднёвы захад ад Паставаў на заходнім беразе возера В. Споры. Назва першапачаткова адносілася да мясцовасці вакол ракі Вараноўка, на што паказвае фармант " –шчына", а пазней перайшла на вёску. Гл. таксама *Вараноўка*.

Варап*а*ева – гарадскі пасёлак за 23 км на ўсход ад Паставаў; чыгуначны вузел (лініі на Лынтупы, Друю, Крулеўшчызну). Вядомы з 1800 года як уладанне графіні Пшаздзецкай. Назва ўтворана ад прозвішча *Варапай* або *Варапаеў*. У аснове ж прозвішча ляжыць састарэлая

славянская аснова “*вароп*”, што значыць “разбой”, “рабаўніцтва”. Па іншай версіі *Варапай – сляпы чалавек*.

Варкаціїшкі – вёска за 21 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Гадуцішак. Назва, верагодна, паходзіць ад фіна-ўгорскай асновы *“vara”* ў значэнні “гара, узвышша, узгорак”.

Варо̀ны – вёска за 16,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 5 км на поўдзень ад Лучая. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, узнікла ад мянушкі *Варона*, якую меў хтосьці з першапасяленцаў. Магчыма, яна такама звязана з супрацьпастаўленнем жыхарам суседняй вёскі Сакалы. На Пастаўшчыне сустракаецца шмат прозвішчаў з асновай “воран”: *Варанец, Варановіч, Варанько*.

Ва̀севічы – вёска за 19 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Варапаева. Вядома з 1861 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад імя *Вася* – формы кананічнага праваслаўнага імя *Васілій*, што азначае з грэчаскай *“царскі”*. Васевічы – нашчадкі Васіля.

Васілѐўшчына – вёска за 24 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на поўнач ад Варапаева. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя Васілій і спачатку распаўсюджвалася на мясцовасць, якая належала жыхару з імем *Васіль*. На Пастаўшчыне сустракаецца шмат прозвішчаў, якія ўтвораны ад гэтага імя: *Васілевіч, Васільеў, Васілеўскі, Васін, Васьковіч, Васюковіч.*

Васілі̀ны – вёска за 19 км на поўнач ад Паставаў на правым беразе ракі Дзісна. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Мясцовая легенда тлумачыць паходжанне назвы ад імён першапасяленцаў Васіля і Лены, аднак трэба меркаваць, назва з’яўляецца старажытнай даславянскай, верагодна угра-фінскай. Яна складаецца з дзвюх асноў: *“vesi”* – “вада” і *“linna”* – “умацаванае месца”, “замак”. Такім чынам,

атрымліваецца зразумелае тлумачэнне: “замак каля ракі”. Параўнаем з назвай эстонскай сталіцы Таллін, дзе “лінн” – “замак”. Праўда, пакуль што рэшткаў старажытнага паселішча ў Васілінах не выяўлена.

Васт*о*чныя (да 1964 года – *Цуцкі*) – вёска за 10 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на ўсход ад Камаяў. Назва ўтворана штучна ў 1964 годзе, калі па Беларусі ішла хваля перайменавання “немілагучных” назваў.

Ваўк*і* – вёска за 37 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Навадруцк, на шашы Віцебск-Вільня. Вядома з 1873 года у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад наймення драпежніка *"воўк"*. Магчыма, такую мянушку (або прозвішча) мелі жыхары вёскі. На Пастаўшчыне шырока распаўсюджана прозвішча Воўк, а таксама сустракаюцца Ваўкоў (рус. Волков), Ваўкавыцкі.

Валк*і* – вёска за 9 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўднёвы захад ад Навасёлак. Паколькі суседні прыпынак цягніка на чыгунцы мае найменне *Валькі*, то можна лічыць, што і паселішча так раней называлася. Назва паходзіць ад слова *"воля, вольны"*. Так называліся населеныя пункты, якія ўзнікалі на новым месцы, а іх жыхары на некалькі год вызваляліся ад падаткаў у казну. Сінонім назве “Слабада”.

В*е*йсішкі – вёска за 30 км на захад ад Паставаў, за 7,5 км на поўнач ад Лынтупаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскага *"весь"*, што азначае “невялікае сельскае паселішча; вёска”. Магчыма паходжанне і ад літоўскага прозвішча Veisys.

Верац*е*і – вёска за 36 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на ўсход ад чыгуначнай станцыі Навадруцк. З 1863 года вядома сяло Верацеі і маёнтак Ф. Куркоўскага. Назва паходзіць са славянскіх моў. У беларускай *"верацея"* – “узгорак, узвышша сярод балот, якое прыдатнае для апрацоўкі”.

Весял*у*ха – вёска за 7,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Лучайка. Вядома з 1905 года ў

Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Верагодна, назва характарызуе вясёлы (бяспечны) вобраз жыцця яе жыхароў. Г. Жаброўскі ў сваёй манаграфіі "Міхнічы" піша:"Побач з Савічамі ляжыць вёска Весялуха, дзе жыхары мелі па пары гектараў, а іх продкі не хацелі разрабляць вялікае поле".

Ве́штарты – вёска за 13 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лучая. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Вештарт*, якое ўтварылася ад літоўскага дзеяслова "*versti*", што значыць "імкнуцца наперад, прабівацца праз перашкоды, жадаць быць вольным". Гэта прозвішча зараз сустракаецца на Пастаўшчыне.

Ві́длы – хутар за 13 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Назва паходзіць з балцкіх моў. У літоўскай "*vidus*" – сярэдзіна, "*lenke*" – лагчына, "*lanka*" – сенажаць. Атрымліваем прыдатнае тлумачэнне: "*вёска, што ляжыць паміж лагчынамі*". Сапраўды, паселішча знаходзіцца паміж ракой Вараноўкай і ручаём, які каля вёскі ўпадае ў раку. У вакольных вёсках назва часцей ужываецца ў форме *Відляне*, што набліжае яе да балцкай першаасновы.

Віле́йты – вёска за 12 км на паўночны захад ад Паставаў на правым беразе ракі Камайка. Назва ўтварылася з трох фіна-ўгорскіх асноў: "*віл*" + "*лей*" + "*ты*", дзе "*віл*" – старыца, азярцо на пойме ракі, "*лей*" – рэчка, яр, а "*ты*" – возера. Такім чынам, атрымліваецца "водная" назва з сэнсам "*возера-старыца на пойме ракі*". Геаграфічны аналіз добра пацвярджае прапанаванае тлумачэнне: рака Камайка, якая цячэ каля вёскі, патрапляе ў неглыбокую катлавіну, у выніку чаго цячэнне яе замаруджваецца і яна ўтварае шматлікія меандры і старыцы. На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Вілейта*, якое магло стаць крыніцай назвы.

Ві́ршалы – вёска за 24 км на захад ад Паставаў. Назва паходзіць з балцкіх моў. Літоўскае "*віршуне*" мае значэнні "верх", "вяршыня", "выток ракі". Гэткі ж сэнс мае і латышскае "*virsune*". Сапраўды, вёска знаходзіцца на ўзвышшы каля

вытока ручая, што ўпадае ў раку Яновіцу.

В*о*йнеўка – вёска за 15 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на захад ад Варапаева. Вядома з 1905 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Можна прапанаваць два варыянты тлумачэння паходжання і сэнсу назвы: 1) ад старажытнаславянскага імя *Война* (у Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Войніч*); 2) ад фіна-ўгорскіх асноў *"oja"*(эст.) – "ручай" і *"neva"*(фін.) – "балота". Славянскі фармант "- ка" характэрны для невялікіх населеных пунктаў. Геаграфічна вёска знаходзіцца каля ладнага па памерах балота, па якім цячэ рачулка. З гэтага вынікае, што назва магла ўтварыцца наступным чынам: спачатку існавала фіна-вугорскае найменне ракі (урочышча) *"войнева"*, у сэнсе - "забалочаны ручай" або "балота з ручаём", а пазней яно перайшла на бліжэйшы хутар, атрымаўшы характэрны канчатак.

В*о*лахі – вёска за 3 км на паўночны захад ад Паставаў каля ракі Мядзелка. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад наймення народа: *"волахі"*, *"валахі"* – жыхары старажытнай дзяржавы Валахіі, якая знаходзілася на поўдні Румыніі. Яны маглі патрапіць на Пастаўшчыну ў якасці палону, які захапілі Полацкія князі ў час ваенных паходаў у паўднёвыя землі. Зараз на Пастаўшыне сустракаецца прозвішча *Волах*.

В*о*лься – вёска за 10 км ад Паставаў. Вядома з 1873 года ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва славянская, паходзіць ад народнага тэрміна *"вольс"* – "зараснік вольхі".

В*ы*гары – вёска за 31 км на захад ад Паставаў, за 10 км на поўнач ад Лынтупаў. Назва славянскага паходжання, якая азначае *месца, выпаленае сярод лесу*. Сапраўды, вёска амаль з усіх бакоў абкружана вялікім лясным масівам.

В*я*заўшчына – вёска за 17 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Камаяў каля ракі Караліноўка. Вядома з 1873 года як уладанне Сулістроўскіх, пазней – засценак Буйко. У 1873 годзе была ў Камайскай

воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад наймення ўрочышча, адметнасцю якога былі дрэвы *вязы*.

Вял*і*чкі – вёска за 36 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўночны захад ад Лынтупаў. Вядома з 1790 года. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі паходзіць ад мянушкі жыхара *"Вялічка"*, які меў, напэўна, вялікі рост. Зараз на Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Вялічка*.

Вярд*а*шышкі – вёска за 39 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. Назва, верагодна, паходзіць ад фіна-ўгорскай асновы *"vara"* ў значэнні "гара, узвышша, узгорак".

Вярц*і*нскія – вёска за 31 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўночны захад ад Казлоўшчыны. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі паходзіць ад прозвішча *Вярцінскі*, якое шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Вяр*э*нькі – вёска за 14 км на поўдзень ад Паставаў. Назва паходзіць ад беларускага сялянскага тэрміна *"вярэнька"*, які мае два значэнні: 1) каробка, плеценая з лубу, бяросты, лазы для пераноскі прадуктаў і гародніны; 2) ганчарны выраб – маленькая гліняная місачка з увагнутымі беражкамі для кармлення дзяцей. Верагодна, хтосьці з першажыхароў вёскі меў такую мянушку. Зараз на Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Вярэнька*.

Г

Гад*у*цішкі (Гадуц*і*шкі) – вёска за 16 км на захад ад Паставаў на мяжы з Летувой. Вядома з сярэдзіны XVI стагоддзя, у 1861 годзе – казённае мястэчка. У 1886 годзе была цэнтрам Гадуцішскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад літоўскага прозвішча *Гайдыс (Gaidys)*, што азначае *"певень"*.

Гайдук*і* – вёска за 38 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 14 на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. "*Гайдук*" – слуга, выязны лакей часоў прыгоннага права. Ад

венгерскага *"hajduk"* – паганяты. Прозвішчы *Гайдук, Гайдуковіч, Гайдукоўскі* і зараз сустракаюцца на Пастаўшчыне.

Гайл*ю*ны – вёска за 38 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў каля ракі Пляка. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Гайлюн*, якое ўтварылася ад літоўскага імя *Гайлюс (Gailius),* што азначае *"багульнік"*. Гэта прозвішча даволі шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Галат*ы*льцы – вёска за 12 км на паўночны захад ад Паставаў, за 8 км на паўночны ўсход ад Гадуцішак на правым беразе ракі Камайка. Назва паходзіць ад прозвішча *Галатылец*, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі, дзе *"гала"* мае значэнне "голы", а *"тылец (тыл)"* – "задняя частка чалавечага цела" (напрыклад, патыліца). У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Галатылец.*

Гал*а*шышкі – вёска за 29 км на захад ад Паставаў, за 11 км на поўнач ад Лынтупаў на мяжы з Літвой. Назва патранімічная, паходзіць ад літоўскага прозвішча Galash (Галаш).

Галб*е*я (Г*о*лбія) – вёска за 25 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 8 км на поўнач ад Варапаева каля возера Галбея. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўза ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, у 1902 годзе – фальварак К. Пшаздзецкага. Назва вёскі ўтворана ад назвы возера. "Хол" у тувінскай мове азначае "возера", а "бі, бія" – "рака". Такім чынам атрымліваем: "рака, якая ўтварае возера". Геаграфічна гэта абсалютна дакладна, але выклікае сумненне сувязь назвы з мовай народа, які жыве ў далёкім Забайкаллі. Магчыма, падобныя тэрміны існавалі і ў фіна-ўгорскіх мовах.

Гар*а*наўшчына – вёска за 34 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 16 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Назва славянскага паходжання, адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць вёскі: яна ляжыць на ўзгорках, што ўзвышаюцца сярод балот. У аснове назвы – геаграфічны тэрмін *"гара".*

Гаўрылавічы – вёска за 18 км на ўсход ад Паставаў на ўсходнім беразе возера Лучай. Вядома з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва ўтворана ад кананічнага імя *Гаўрыла (Гавриил)*, якое меў хтосьці з жыхароў, а нашчадкаў яго называлі Гаўрылавічамі. Зараз на Пастаўшчыне сустракаецца шэраг прозвішчаў, якія ўтвораны ад імя Гаўрыла, што з яўрэйскай мовы значыць *"муж Божы, моц Божая": Гаўрылаў, Гаўрыленка, Гаўрылін, Гаўрыловіч, Гаўрыльчык.*

Гвоздавічы – вёска за 18 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 2 км на поўдзень ад Камаяў. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Па сваёй форме назва патранімічная і ўтворана, верагодна, ад прозвішча *Гвозд або Гваздовіч*. На Пастаўшчыне зараз сустракаюцца такія прозвішчы як *Гвозд, Гваздзеўскі, Гваздоўскі*. Магчыма, асновай назвы вёскі стаў старажытнаславянскі тэрмін *"гвазда"* ў значэнні "гразь", "багна". Сапраўды, на захад ад вёскі знаходзіцца даволі вялікае і гразкае балота.

Гінькі – вёска за 33 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. Назва паходзіць ад прозвішча *Гінько,* якое ўтварылася ад літоўскага імя *Gintautas (Гінтаўт).* Прозвішча *Гінько* вельмі распаўсюджана на Пастаўшчыне. Сустракаюцца таксама прозвішчы *Гінявец, Гінтаўт.*

Гіруці – вёска за 36 км на захад ад Паставаў, за 2,5 км на захад ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, уваходзіла ў маёнтак Раманішкі, які належаў Ксаверыю Даўгяла. Назва паходзіць ад прозвішча *Гіруць*, якое ў сваю чаргу ўтварылася ад літоўскага слова *"giria"* – "лес". На Пастаўшчыне сустракаецца даволі многа прозвішчаў з асновай "гір": *Гіруць, Гірін, Гір'ят, Гірдзей, Гірстун.*

Глінскія – за 37 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. Вядома з 1873 года ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча пасяленцаў – *Глінскіх*. Гэта прозвішча і зараз сустракаецца на Пастаўшчыне.

Гл́ншчына – вёска за 23 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на захад ад Дунілавічаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Вёска знаходзіцца на ледавіковых марэнных узгорках, для якіх характэрны *гліністыя глебы*, што і стала асновай для ўтварэння назвы ўрочышча, а затым і вёскі.

Го́гава – вёска за 10 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Лучайка. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва патранімічная, паходзіць ад імені *Гога*, якое з'яўляецца мясцовай трансфармаванай формай кананічнага імя *Георгій*, што значыць з грэчаскай *"земляроб"*.

Гражу́лі – вёска за 31 км на захад ад Паставаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета як вёска і засценак Нарвойта. Назва паходзіць з літоўскай мовы, дзе *"grazu"* азначае "прыгожа, цудоўна".

Гро́дзі – вёска за 19 км на захад ад Паставаў каля возера Янкішкі. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскай асновы *"град"* (польскае *"grud"*) у значэнні "ў+мацаванае месца", "замак". Параўнаем з назвай горада "Гродна". Ад паселішча ўтварылася прозвішча *Гродзь*, якое сустракаецца зараз на Пастаўшчыне.

Гро́цкаўшчызна – вёска за 35 км на захад ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Лынтупаў. Назва ўтворана ад славянскай асновы *"груд"*: у польскай мове *"grad"* – "узвышша", "сухое месца сярод балота". Сапраўды, вёска ляжыць на невялікім узвышшы у вялікім лясным масіве каля ладнага па памерах балота.

Гру́здава – вёска за 15 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. Былое мястэчка. Паходжанне назвы мясцовыя жыхары выводзяць ад *грыбоў груздоў*. Маўляў, у часы, калі вакол паселішча спрэс цягнулася пушча, тут іх расло вельмі багата. Насельнікі вёскі і ваколіцаў назапашвалі грузды на зіму, што давала ім магчымасць выжыць у пару няўроду ці бяскорміцы. Больш верагоднай можна было б прызнаць версію пра ўтварэнне Груздава ад слова *"груд"* – "узгорак", "курган", што добра стасуецца з рэльефам мясцовасці, бо цэнтральная

частка вёскі ўзвышаецца над ваколіцамі на 15-20 метраў. У польскай мове ёсць слова *"gruz"*, якое мае значэнні "шчэбень" і "разваліны", "руіны". Звернем увагу і на тое, што "шчэбню" ў беларускай мове адпавядае сінонім "друз". Гэта сведчыць пра тое, што і польскі, і беларускі тэрміны маюць агульную славянскую аснову, у якой толькі адбылося чаргаванне блізкіх гукаў. У літоўскай мове таксама ёсць блізкае па значэнні слова *"gruzdas"* – будаўнічае смецце, друз.

Гр*ы*дзькі – вёска за 8 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на захад ад Навасёлак. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага тэрміна *"грыдзь"* – так ў даўнія часы называлі ваяроў малодшай княжацкай дружыны.

Грынв*а*льды – вёска за 34 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на поўнач ад Казлоўшчыны каля возера Грынвальды, былы маёнтак. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць з нямецкай мовы, дзе *"grun"* – зялёны, *"wald"* – лес. Магчыма, вёска названа ў гонар знакамітай Грунвальдскай бітвы 1410 года.

Гр*э*йцева – вёска за 12 км на ўсход ад Паставаў, за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад Навасёлак. Вядома з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва патранімічная, паходзіць ад літоўскага імя *Greitas*, што азначае *"хуткі"*.

Г*у*біна – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Навадруцк. Існавала ў 1860-я гады. Назва, верагодна, паходзіць ад старажытнаславянскага тэрміна *"губа"* у значэнні "сядзіба", "двор", "хата", "мыза" (паводле У. І. Даля). Прозвішча Губін на Пастаўшчыне не сустракаецца, хаця ў даўнейшыя часы чалавек з такім прозвішчам мог тут жыць і ад яго магла пайсці назва.

Гуд*э*лішкі (Гудз*е*лішкі) – вёска за 28 км на захад ад Паставаў, за 11 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў на мяжы з Летувой. Назва паходзіць з балцкіх моў. У літоўскай *"gudas"* – "чужы". Гудамі продкі летувісаў называлі славян (беларусаў), якія для іх былі чужынцамі. З гэтага вынікае, што вёска здаўна была населена славянамі-крывічамі. На

Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы з асновай "гуд": *Гудас, Гуданец, Гудоўшчыкаў*.

Гумб*я*ны – вёска за 29 км на захад ад Паставаў, за 5 км на паўночны усход ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад літоўскага апелятыва *"gumbinas"* – "узгорачак". Яна вельмі дакладна характарызуе геаграфічную асаблівасць паселішча: невялікая вёсачка займае вехнюю частку невялікай гары.

Гум*е*ннікі – вёска за 18 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 12 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Назва ўтворана ад асновы *"гумно"* – вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту збожжа.

Г*у*рніца – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 9 км на ўсход ад Лынтупаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва ўтворана ад польскага слова *"gora" (гура)* – "гара", што дакладна адлюстроўвае галоўную асаблівасць мясцовасці – наяўнасць высокіх узгоркаў, сярод якіх і помнік гісторыі - курган "магіла рыцара".

Г*у*та – вёска за 24 км на ўсход ад Паставаў, на рацэ Галбяіца каля возера Галбея. Вядома з 1905 года, калі купец Каган купіў у графа Пшаздзецкага ўчастак лесу і ў 1913 годзе пабудаваў шклозавод. Славянскі прамысловы тэрмін *"гута"* паходзіць ад нямецкага *"hutte"* у значэнні "пабудова", "плавільня", "металургічны завод". У Беларусі гэты тэрмін адносіўся пераважна да шклозаводаў. Да нядаўняга часу ў вёсцы Гута знаходзіўся шклозавод.

Г*у*тары – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў каля ракі Лучайка. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад тэрміна *"гута"* у значэнні "шкляны завод"; *"гутар"* – чалавек, які працаваў на гэтым заводзе. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Гутар (вельмі шырока), Гутараў. Разам з гэтым нельга выключаць і версію паходжання назвы ад беларускага дзеяслова *"гутарыць"* – "размаўляць". З гэтага вынікае і мянушка: гутар – чалавек, які любіць пагаварыць.

Г*э*йбавічы (Г*е*йбавічы) – вёска за 26 км на захад ад Паставаў. Вядома з 1873 года як уладанне Сулістроўскіх у

Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *Гейбавіч*, якое ўтварылася ад літоўскага імя *Geibas*, што азначае "слабы, хілы". На Пастаўшчыне і зараз сустракаюцца прозвішчы *Гейбавіч, Гайбовіч*.

Д

Дамуц*і* – вёска за 38 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на поўдзень ад Лынтупаў. Вядома з 1790 года. З 1843 года была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, належала Юрыю Бішэўскаму. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"дом"* – "хата", "жылая пабудова". Вядомым мядзельскім краязнаўцам Іванам Драўніцкім запісана легенда пра паходжанне назвы вёскі ад выразу *"Dama mutis"*, што азначае "жанчына-маці" – так называлі каралеўну Бону Сфорцу, маці караля Жыгімонта Аўгуста.

Д*а*неўцы – вёска за 21 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 18 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя. Верагодна, назва паходзіць ад імя *Дань*, якое з'яўляецца формай кананічнага імя *Данііл (Даніла)*, у літоўскай мове *Danys*, што азначае *"суддзя Божы"*. На гэта падказваюць прозвішчы *Дань, Данькоў*, якія сустракаюцца на Пастаўшчыне. Нельга выключаць і паходжанне назвы ад слова *"даніна"* – натуральны або грашовы падатак, які ў старажытныя і сярэднія вякі збіраўся князем, феадалам са сваіх падданых. Такім чынам, назва вёскі падкрэслівае залежнае становішча яе жыхароў ад уладальнікаў.

Дарав*о*е – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. Вядома з 1781 года як сяло ў Дунілавіцкім маёнтку, у 1861 – як вёска Дарава. У 1873 годзе была ў Норыцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Верагодна, назва паходзіць ад славянскага *"дарыць"* і адлюстравала факт пераходу паселішча ў якасці падарунка, *"у дар"*, да новага ўладальніка.

Д*а*шкі (1) – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Варапаева. Вядома з 1905 года як вёска і засценак у Лучайскай воласці Вілейскага павета

Віленскай губерні. Назва паходзіць ад беларускага слова *"дах"* у значэнні "хата", "жыллё", "прытулак". Запазычана з нямецкай мовы, дзе *"Dach"* – страха. Назва "Дашкі" даволі распаўсюджаная на Беларусі. У Пастаўскім раёне ёсць аж пяць такіх вёсак. Ад гэтай асновы утворана і назва вёскі Дашчынкі. На Пастаўшчыне распаўюджаны прозвішчы *Дашкевіч, Дашчынскі*.

Д*а*шкі (2) – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Паходжанне назвы гл. *Дашкі(1)*.

Д*а*шкі (3) – вёска за 5 км на захад ад Паставаў. Паходжанне назвы гл. *Дашкі (1).*

Д*а*шкі Вял*і*кія – вёска за 14 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Паходжанне назвы гл. *Дашкі (1).*

Д*а*шкі Мал*ы*я – вёска за 2 км на захад ад вёскі Дашкі Вялікія. Паходжанне назвы гл. *Дашкі (1).*

Д*а*шчынкі – вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад беларускага слова *"дах"* у значэнні "хата", "жыллё", "прытулак". На Пастаўшчыне распаўсюджаны прозвішчы *Дашкевіч, Дашчынскі*.

Дварч*а*ны (1) – вёска за 6 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 1,5 км на паўночны захад ад возера Світа. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"двор"* у значэнні "маёнтак, памесце". Мясцовая легенда расказвае пра тое, што на месцы вёскі стаяў калісьці раней панскі двор, сам яго ўладальнік быў злым і жорсткім гаспадаром. За гэта яго і празвалі "чорным" (па-польску "чарны"), а маёнтак сталі зваць *"двор чарны"*. З часам назва паступова змянілася і ператварылася ў Дварчаны.

Дварч*а*ны (2) – вёска за 38 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. Вядома з пачатку XX стагоддзя як цэнтр Дварчанскай сельскай акругі Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні.

У 1905 годзе тут знаходзіўся флігель і вадзяны млын Бішэўскага. Паходжанне назвы гл. *Дварчаны(1)*.

Дземяш*ы* – вёска за 23 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на захад ад Варапаева. Вядома з 1905 года як вёска і выселкі ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва патранімічная, паходзіць ад імя *Дземяш*, якое з'яўляецца мясцовай формай імя *Дзям'ян* (кананічнае – *Даміан*, што азначае *"які належыць багіні Дамініі"*). У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Дземяшонак, Дземяшкевіч, Дзяменцьеў, Дзямчук*.

Дзерав*я***нкі** – вёска за 8 км на поўдзень ад Паставаў на ўсходнім беразе возера Доўжа. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўза ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча мясцовых жыхароў Дзеравянка, якое ўтворана ад славянскага слова *"дзярэўня"* – "ралля, месца, якое расчышчана ў лесе пад земляробства, зямельны надзел, хутар". Можна меркаваць, што *"дзеравянка"* – гэта чалавек, які займаўся расчысткай лесу пад раллю. Зараз гэта прозвішча адно з самых распаўсюджаных на Пастаўшчыне.

Дз*е***ткава (Дз***е***дкава)** – вёска за 15 км на поўнач ад Паставаў каля ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Можно меркаваць, што назва ўтварылася ад той жа старажытнаславянскай асновы *"дзет"*, што і *"дзяцінец"* – так у даўнія часы называлася ўмацаванае месца паселішча. Пакуль што рэшткаў старажытных умацаванняў каля вёскі не выяўлена, аднак тое, што яна знаходзіцца ў месцы злучэння двух у мінулым суднаходных рэк (Мядзелка і Лучайка), дзе трэба было мець астрог для кантролю за водным транспартным шляхам, робіць прапанаваную версію даволі прываблівай.

Дзядз*е***нкі Г***о***рныя** - вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на ўсход ад Дунілавічаў. Назва паходзіць са славянскіх моў. У польскай *"dziad"* мае значэнні "дзед, стары" і "бедны, незаможны". Адсюль, Дзядзенкі – гэта паселішча беднякоў. Прыметнік "Горныя" падкрэслівае

геаграфічна вышэйшае размяшчэнне вёскі *("па гары")* ў параўнанні з суседнімі Дзядзенкамі Дольнымі, якія ляжаць у нізіне *("па долу")*.

Дзядз*е*нкі Д*о*льныя – вёска за 1 км на поўнач ад вёскі Дзядзенкі Горныя. Тлумачэнне назвы гл. *Дзядзенкі Горныя*.

Дзяўг*у*ны – вёска за 22 км на захад ад Паставаў, за 14 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1821 года. Назва паходзіць, верагодна, з балцкіх моў. У літоўскай *"dievas"* азначае "Бог, Гасподзь", *"dievukas"* – "бажок, кумір"; слова *"kûnytis"* мае значэнне "ўвасабляцца, ператварацца". З гэтага вынікае, што *"дзяўгун" ("dievas kûnytis")* – увасабленне Бога. Так маглі называць жрацоў-вайдэлотаў, а на месцы сучаснай вёскі магло знаходзіцца капішча або свяцілішча. Гэта пацвярджаецца і старажытным гарадзішчам, што ўзвышаецца ў цэнтры Дзяўгунаў.

Дзяўг*у*цішкі – вёска за 37 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3,5 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад літоўскага прозвішча *Дзеўгуць*, у аснове якога *"dievas",* што азначае "Бог, Гасподзь". Прозвішча *Дзеўгуць* пашырана на Пастаўшчыне.

Д*о*ўжа – вёска за 8 км на поўдзень ад Паставаў каля возера Доўжа. Вядома з 1861 года як маёнтак Тызенгаўза. У 1905 годзе – фальварак Пшаздзецкіх. Вёска атрымала сваё найменне ад возера. Назва славянская і сведчыць пра адметнасць гэтага вадаёма – яго *даўжыню*. Сапраўды, маючы найбольшую шырыню ўсяго 0,42 км, яго даўжыня налічвае 4,89 км. Канчатак "-жа" ў назве ўзмацняе адметную ўласцівасць возера.

Драбыш*ы* – вёска за 6 км на захад ад Паставаў. Назва паходзіць ад мянушкі-прозвішчы *Дробыш*, якое мае значнае распаўсюджанне на Пастаўшчыне. Само прозвішча, верагодна, паходіць ад асновы *"дробны"*, што значыць "невялікі, маларослы". Такую мянушку меў нехта з першажыхароў вёскі. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Дробыш, Драбовіч, Дробат*.

Дразд*о*ўшчына – вёска за 29 км на ўсход ад Паставаў,

за 4 км на ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Норыцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі ўтварылася ад наймення ўрочышчы, дзе вадзілася многа *драздоў* – лясных птушак атраду вераб’іных. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Дрозд, Драздоў, Драздовіч.*

Дразд*ы* – вёска за 33 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Норыцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Іншая назва – Драздоўшчына. Тлумачэнне назвы гл. *Драздоўшчына*.

Дубр*а***ва** – вёска за 22 км на паўночны ўсход ад Паставаў каля ракі Паловіца. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўза ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва адлюстроўвае асаблівасці расліннасці ў ваколіцах вёскі: *дубрава* – дубовы гай. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Дуброўскі*.

Дубр*о***ўшчына** – вёска за 25 км на паўднёвы захад ад Паставаў каля ракі Страча. Вядома з 1921 года як засценак. Назва адлюстроўвае асаблівасці расліннасці ў ваколіцах вёскі: *дубрава* – дубовы гай.

Дук*і* – вёска за 4 км на паўднёвы захад ад Паставаў каля возера Загацце. Вядома з 1873 года ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Тлумачэнне назвы можна звязаць з польскім *"duct"*, што значыць “просека, мяжа”. Вёска знаходзіцца на этнічнай мяжы паміж славянскімі і балцкімі плямёнамі, на што паказваюць назвы недалёкіх вёсак Рубеж, Ліцьвінкі, Русакі, Маскалішкі. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Дук*.

Дун*і***лавічы (Дан***і***лавічы)** – аграгарадок за 25 км на ўсход ад Паставаў. Вядома з 1473 года як уладанне князя Аляксандра Гальшанскага. Назва вёскі патранімічная, сведчыць пра тое, што ў паселішчы пражывалі нашчадкі першапасяленца Данілы (кананічнае Данііл), што азначае *"суддзя Божы"*. Ад гэтага імя ўтворана шмат прозвішчаў, з якіх на Пастаўшчыне сустракаюцца: *Данілевіч, Данілаў, Данілейка, Даніленка, Данільчанка, Данілюк*.

Е, Ё

Ёдаўцы – вёска за 14 км на паўднёвы захад ад

Паставаў, за 3,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Вядома з 1873 года ў Камайскай воласці Свянцянскага павета, уладанне Сулістроўскіх. Назва ўтворана ад літоўскай асновы *"juodas"* – "чорны". Падставай для ўзнікнення такой назвы магло стаць імя жыхара *(Ёдас, Ёдка)*, або чорная зямля гарадзішча, якое, па звестках археолага Л. Побаля, знаходзілася каля вёскі.

Ельнякі – вёска за 13 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 5 км на поўнач ад Навасёлак каля ракі Снарыхаўка. Вядома з пачатку XX стагоддзя як засценак Клейгельса. Назва адлюстроўвае асаблівасць вакольнай расліннасці: наяўнасць *яловых лясоў*, якія і зараз акружаюць вёску.

Ёцішкі – вёска за 20 км на захад ад Паставаў, за 5 км на захад ад Гадуцішак. Назва паходзіць з балцкіх моў, дзе літоўскае *"juockis"* азначае "смуглявы, чарнявы".

Ж

Жакі – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 4 км на поўнач ад Лынтупаў. Вядома з 1861 года ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад балцкай асновы *"saka" (літ.), "saka"(лат.)* – "любое адгалінаванне", напрыклад, рукаво ракі, адасабленне ўзгорка. Вёска знаходзіцца на ўзвышанай градзе, якая адыходзіць ад значнага па памерах узвышша.

Жалязоўшчына – вёска за 11 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1905 годзе фальварак Бутлера ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва, верагодна, звязана з мясцовасцю, дзе ў старажытнасці вялася здабыча *балотнай руды і выплаўка жалеза*.

Жардэлі (Жардзелі) – вёска за 25 км на захад ад Паставаў, за 10 км на ўсход ад Лынтупаў. У 1905 годзе засценак у Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моў, дзе *"zardiena, zardis"* - загарадка для жывёлы, загон. У беларускай мове ёсць словы *"жэрдка, жардзіна"* – "доўгая палка, якая выкарыстоўваецца звычайна для загарадкі".

Жарскія – вёска за 23 км на захад ад Паставаў, за 11 км на ўсход ад Лынтупаў. У 1905 годзе фальварак Асінскага

ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Верагодна назва вёскі паходзіць ад урочышча, дзе ўчастак леса быў выпалены для сельскагаспадарчай апрацоўкі. Старажытнаславянскі тэрмін *"жар"* звязаны з працэсам падсечна-агнявога земляробства і як раз адносіцца да гарэлага лесу. У літоўскай мове ёсць слова *"zarijos"* - "жар". Мажліва і паходжанне назвы ад прозвішча Жарскі. Праўда, зараз у раёне людзей з такім прозвішчам няма, але ёсць аднакарэнныя Жарын, Жаркоў.

Жарсцв*я*нка – вёска за 24 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 13 км на поўдзень ад Варапаева. Вядома з пачатку ХХ стагоддзя як вёска Дунілавіцкай воласці і засценак Сварцэвічаў. Назва паходзіца ад беларускага слова *"жарства"* – буйны калючы пясок, дробныя каменьчыкі, якія ўтвараюцца ад разбурэння горных парод.

Жары – вёска за 17 км на паўднёвы захад ад Паставаў. Вядома з 1921 года ў Камайскай гміне. У 1937 годзе засценак Жарскія. Назва паходзіць ад асновы *"жар".* Тлумачэнне гл. *Жарскія*.

Жвір*ы*нка – хутар за 30 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў, былы засценак. Назва паходзіць ад літоўскага *"zvyras"*, што азначае "гравій, буйны пясок".

Жв*о*йрышкі Вял*і*кія – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 11 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. Вядома з пачатку ХХ стагоддзя ў Лынтупскай воласці. Пазва, верагодна, паходзіць ад літоўскага *"zverti"*, што азначае "звер". Магчыма, існавала літоўскае паганскае імя *Zvairis або Zvojris*.

Ждан*ы* – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 11 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Норыцкай воласці. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага імя *Ждан*. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Жданаў, Ждановіч, Жданковіч*.

Ж*у*кава – вёска за 31 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Норыцкай воласці. Назва паходзіць ад прозвішча *Жукаў*, якое ў сваю чаргу ўтварылася ад мянушкі *Жук*. Прозвішча з

асновай "жук" адно з самых распаўсюджаных на Пастаўшчыне: *Жук, Жукаў, Жукоўскі, Жук'ян*.

Жук*і* – вёска за 9 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 15 км на захад ад Варапаева. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Пастаўскай воласці. Тлумачэнне гл. *Жукава*.

Ж*у*перкі – вёска за 29 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на ўсход ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў маёнтку Руцкое Вілейскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моў. У літоўскай "*azu*" азначае "за", "*perkasas"* – "канал, канава, перакоп". Адсюль вынікае, што жуперкі – гэта месца за канавай.

Жыг*у*ны (Жыг*у*ні)– вёска за 20 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 17 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1873 года ў Камайскай воласці як уладанне Сулістроўскага. Назва, верагодна, паходзіць з літоўскай мовы ад прозвішча *Zygunas,* што азначае *"пасланец, хадок".* Сярод беларусаў ёсць прозвішчы *Жыгун, Жыгуноў*.

Лінгвіст I. Яшкін зафіксаваў дыялектнае значэнне слова *"жыгун" – "сухі, цякучы, вельмі тонкі пясок".*

Жыл*і*нскія – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на захад ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Жылінскі*, якое ўтварылася ад мянушкі *"жыла, жылісты"*, што значыць "сухарлявы, мускулісты". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Жылаў, Жылевіч*.

З

З*а*балацце – вёска за 13 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Лучайка. У пачатку XX стагоддзя ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча паселішча – знаходжанне *"за балотам".*

Забр*о*ддзе – вёска за 3 км на паўночны захад ад Паставаў каля ракі Мядзелка. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча – месцазнаходжанне *"за бродам"*, які існаваў праз Мядзелку ў паўночнай частцы Паставаў.

Заг*а*чча – вёска за 5 км на паўднёвы захад ад Паставаў

каля ракі Спарыцы. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча – вёска знаходзіцца *"за гаццю"*. Гаць – насціл з бярвення, галля, ламачча для праезду цераз балота або гразкае месца – раней існавала праз раку Спарыца. Яна называлася "Чортаў мост" і была небяспечная для праезду, бо, паводле слоў мясцовых жыхароў, багністая мясцовасць неаднаразова засмоктвала жывёлу, вазы, а ў вайну нават танк.

Заготскот – вёска за 3 км на захад ад Паставаў. Вядома з 1963 года ў Свілельскім сельсавеце. Населены пункт узнік пры жывёлапрыёмным пункце УП "Каапнарыхтпрамторг", а назва адлюстороўвае яго функцыю.

Задзеўе – вёска за 3 км на захад ад Паставаў каля возера Задзеўскае. Вядома з 1873 года ў Ясеўскай воласці. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча – *"за дзеўем"*. Дзеўе – гэта ранейшая назва возера Задзеўскае.

Заканоўшчына – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на ўсход ад Варапаева. Назва адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць паселішча – месцазнаходжанне *"за конам"*. Старажытнаславянскае *"конъ"* азначала "рад", "мяжа", "граніца", "канец". З гэтага вынікае, што заканоўшчына – гэта мясцовасць, якая ляжыць за мяжой нечых уладанняў.

Залессе – вёска за 28,5 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 13 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў, за 2 км на ўсход ад возера Балдук. Назва паказвае асаблівасць геаграфічнага становішча – *"за лесам"* ад вёскі Станчыкі.

Заруддзе – вёска за 32 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 15 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. У 1946 годе ў Ласіцкім сельсавеце. Назва адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць вёскі – яна ляжыць *"за рудой"*. Аснова *"руда"* сустракаецца як у славянскіх, так і ў балцкіх мовах і мае некалькі значэнняў. Геаграфічны аналіз паказвае, што ў дадзеным выпадку рудой называецца вялікае лясное балота з чырванаватай вадой, у якой утрымліваецца шмат балотнага бурага жалезняку - ліманіту. За гэтым балотам і ляжыць

вёска.

Зар*э*жжа – вёска за 28 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 16 км на поўдзень ад Варапаева каля ракі Заражанка. У пачатку XX стагоддзя ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва ўтварылася ад старажытнаславянскага тэрміна *"зараза"* , які ўжываўся ў значэннях "цяжкапрахадзімая мясцовасць", "лес з ярамі".

Зар*э*цкія – вёска за 24 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км на ўсход ад Варапаева. Вядома з 1878 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Зарэцкі (той, хто жыў за ракой)*. *Зарэцкі* – прозвішча, якое шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Зах*а*раўшчына – вёска за 6 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Лучайка. Вядома з 1873 года ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад імя *Захар*, якое ўтворана ад кананічнага хрысціянскага *Захарый*, што ў яўрэйскай мове азначае *"памяць Гасподняя"*. На Пастаўшчыне шырока распаўсюджаны прозвішчы *Захарыч, Захарэвіч, Захарчанка*. Існуе легенда, што першапачаткова вёска называлася Закараўшчына з прычыны таго, што жыхары тутэйшай мясцовасці актыўна ўдзельнічалі ў паўстаннях XIX стагоддзя супраць расійскай акупацыі, за што і былі пакараныя.

З*э*нькава – вёска за 19 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 12 км на паўднёвы захад ад Варапаева каля ракі Смычыца. Назва ўтворана ад кананічнага польскага імя *Зянон (Zenon)*, што азначае *"прападобны"*. Гэта імя на Пастаўшчыне сустракаецца ў вытворнях формах *Зэнька, Зэнусь, Зэнак,* якія адлюстраваліся ў прозвішчах *Зяневіч, Зянкоў, Зянько, Зянькоў.*

I

Ігн*а*цішкі – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 2 км на поўдзень ад Лынтупаў. Вядома з 1873 года як засценак у Лынтупскім маёнтку. Назва патранімічная, утворана ад каталіцкага польскага імя Ignacy (кананічнае праваслаўнае Игнатий). У размоўнай форме ўжываецца Ігнацы. На

Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы Ігнацьеў, Ігнатовіч, Ігнаткоў, Ігнатане.

Ідаліна – вёска за 12 км на поўдзень ад Паставаў каля ракі Мядзелка. У 1921 годзе засценак і вёска ў Манькавіцкай гміне. Назва, верагодна, паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе ў эстонскай "ida" – "усход", а "linn" – "горад, паселішча, замак". Такім чынам, Ідаліна – усходняе паселішча, што можа быць, улічваючы знаходжанне вёскі на ўзгорку каля былой суднаходнай ракі Мядзелка. Мясцовыя жыхары тлумачаць паходжанне назвы ад імя Ідолка: так звалі калісьці даўно ўладальніцу гэтага паселішча.

Інтока – вёска за 11 км на паўночны захад ад Паставаў на мяжы з Летувой. Назва паходзіць ад літоўскага "intakas", што азначае "прыток". Вёска сапраўды знаходзіцца ў месцы ўпадзення ракі Лігума ў раку Камайка.

К

Кабыльнішкі – вёска за 36 км на захад ад Паставаў, за 7 км на паўночны захад ад Лынтупаў. Назва паходзіць, верагодна, ад славянскай асновы *"кобь"* – *"чары, чараўніцтва"*. Сустракаецца і слова *"кабыльнік"* у значэнні *"чараўнік, калдун"*. Магчыма, назва падказвае месца, дзе ў даўнейшыя часы знаходзіліся капішчы або свяцілішчы. Можна вывесці паходжанне назвы і ад польскага *"kobylak"*, што азначае *"конскае шчаўе"*. Даўней слова "кабыльніца" азначала "конскі тракт".

Кавалёва – вёска за 18 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўночны захад ад Варапаева. Назва паходзіць ад прозвішча або занятку чалавека: *"каваль"* – "майстар, які займаецца коўкай металу". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Кавалёў, Кавалевіч, Кавалеўскі, Каваленка, Кавалёнак, Коваль*, *Кавальскі, Кавальчанка, Кавальчук, Ковач.*

Кавалі (1) – вёска за 31 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Казлоўшчыны. Сяло Кавалі (Кавалёва) належала глыбоцкім кармелітам, у 1740 годзе перайшло ў казну. У пачатку XX стагоддзя вёска была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Тлумачэнне назвы гл.

Кавалёва.

Кавал*і* (2) – вёска за 38 км на захад ад Паставаў, за 4,5 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Кавалёва*.

Кавал*і* (3) – вёска за 14 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лучая. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, належала Тызенгаўзу. Тлумачэнне назвы гл. *Кавалёва*.

Кадук*і* – вёска за 10 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы ўсход ад Кураполля паміж азёрамі Лапухова і Бярозаўка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад мянушкі жыхароў, паселішча якіх узнікла на невысокай выспе сярод балот і азёр. *"Кадук"* у беларускай мове азначае *"чорт, д'ябал"*.

Казар*о*ўшчына – вёска за 29 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на паўночны ўсход ад Варапаева каля ракі Чэртка. У пачатку XX стагоддзя у Пастаўскай воласці. Назва паходзіць ад прозвішча *Казаравец (Казаровец)*, якое ўтварылася, верагодна, ад формы старажытнаславянскага імя *Казимир*, каталіцкае польскае *Kazimierz*. Першапачаткова яна адносілася да мясцовасці, на што паказвае фармант "-шчына". У Пастаўскім раёне шырока распаўсюджаны прозвішчы *Казаровец, Казура, Казаровіч.*

Казім*е*рцы – вёска за 26 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 14 км на поўнач ад Варапаева каля ракі Паловіца. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці як уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага імя *Казимир*, каталіцкае польскае *Kazimierz*. На аснове польскай формы ўтварыліся формы рэгіянальныя: Казімеж, Казімер, Казьмер. У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Казімірскі.*

Казіч*ы* – вёска за 5 км на захад ад Паставаў на правым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Козіч*, якое ўтворана ад імя або мянушкі *Каза*

(Казёл). У старажытнасці гэта імя было пачэсным, бо каза – татэмная жывёла, сімвал урадлівасці. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Козіч, Козел, Казелька, Казельскі, Казенка.*

Казл*о*ўшчына – вёска за 34 км на ўсход ад Паставаў, за 11 км на паўночны ўсход ад Варапаева на паўночным беразе возера Ласіца. Да пачатку XX стагоддзя вядома як маёнтак Казлоўск князёў Друцкіх-Любецкіх, які да XV стагоддзя належаў Жабам. У аснове назвы – прозвішча *Казлоў*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Казлоў, Казловіч, Казлоўскі, Козел.*

Казнадз*е*юшкі – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад славянскага слова *"казнадзей"*, якое складаецца з дзвюх частак: *"казна"* – *"грашовыя сродкі, маёмасць"* і *"дзеяць"* – *"дзейнічаць, рабіць"*. Можна параўнаць са словамі дабрадзей, ліхадзей, чарадзей. Адсюль можна вывесці і тлумачэнне тэрміна *"казнадзей"* як *"кіраўнік маёмасці, грашовых сродкаў; казначэй"*. Але ў звязку з прыведзенымі прыкладамі, першую частку назвы можна растлумачыць са славянскага *"козні"*, што азначае *"злыя, нядобрыя намеры"* (выразы "строить козни, вражеские козни"). Тады слова набудзе іншы сэнс: *"казнадзей"* – *"чалавек, які дзейнічае са злымі намерамі"*. Паводле мясцовай легенды, у даўнія часы, калі Лынтупы былі вялікім княжым горадам, то ў прадмесці Казнадзеюшкі захоўвалася казна – грашовы скарб нальшчанскага князя Даўмонта.

Кал*е*еўцы – вёска за 12 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 4 км на захад ад Груздава. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Калей* – формы кананічнага хрысціянскага *Мікалай (Николай)*, што азначае *"пераможца народаў; народны герой"*.

Кал*і*наўка (да 1966 года *Кукішы, Кукішкі*) – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на поўдзень ад Варапаева каля ракі Смычыца. У пачатку XX стагоддзя ў Лучайскай воласці. Назва ўтворана ад слова *"каліна"* – *"кустовая расліна*

сямейства бружмелевых з белымі кветкамі і чырвонымі горкімі ягадамі". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Каліна, Калінін, Калінчанка, Каліноўскі, Калінскі, Калінаў*.

Калíты – вёска за 30 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе фальварак, вёска, засценак, старожка. Назва паходзіць, верагодна, ад прозвішча *Каліта*. Гэта слова ў славянскіх мовах мае значэнні *"грошы, багацце"* і *"паходная сумка, торба"*. У гісторыі Расіі быў цар Іван Каліта – "грашовы мяшок". Аднак нельга выключаць і магчымасць паходжання назвы ад стараславянскай асновы *"кал"* у значэнні *"гразь, бруд"* з улікам таго, што ў польскай мове ёсць дзеяслоў *"kalac"* – *"гразніць, пэцкаць"*. У фіна-ўгорскіх мовах сустракаецца тэрмін *"кал"* (хант.) у значэнні *"балота"*. Да такой версіі схіляе тое, што паселішча знаходзіцца ў нізкай забалочанай мясцовасці, за 1 км на захад ад вёскі ляжыць урочышча Каліціна, а недалёка ад яго – моцна забалочанае возера Халосенскае, аснова назвы якога таксама мае корань "хал (кал)". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Каліта, Калітскі, Каліцкі.*

Камáі – вёска за 15 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 19 км на ўсход ад Лынтупаў. Упамінаецца ў пачатку XVI стагоддзя як маёнтак князя Глеба Юр'евіча Пронскага; як мястэчка згадваецца ў 1550 годзе. У 1886 годзе – цэнтр Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"кам"* – *"рака"*, *"плынь"* (удм.). Першапачаткова ўзніклі назвы ракі Камайка і Камайскіх азёр, а ад іх і назва вёскі.

Кáменка – вёска за 19 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы захад ад Дунілавічаў за 1 км на паўднёвы ўсход ад возера Каменскае. Назва паходзіць ад славянскага *"камень"* – *"усялякая цвёрдая горная парода"* - і характарызуе асаблівасць мясцовых грунтоў: тутэйшыя ледавіковыя марэнныя ўзгоркі ўтрымліваюць шмат камянёў. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Камянецкі, Каменскі, Каменка, Камінскі.*

Кан*я*бічы – вёска за 17 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 4,5 км на поўдзень ад Камаяў. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета, належала Сулістроўскаму. Назва, верагодна, паходзіць ад мянушкі: *канябіч* – чалавек, *які звязаны з коньмі*. Заманлівай падаецца версія тлумачэння наймення вёскі ад лацінскага Cannabis sativa, што азначае *"дзікія каноплі"*.

Карабаніха – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў, за 3,5 км на паўднёвы захад ад Варапаева. Назва паходзіць ад беларускага прыметніка *"карабаты"*, што азначае *"няроўны, скрыўлены, пагнуты"*. На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Карабановіч*.

Карал*е*ўцы – вёска за 21 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на захад ад Камаяў, за 1 км на поўнач ад возера Лодасі. Назва паказвае прыналежнасць паселішча – яно было каралеўскім уладаннем.

Карал*і* – вёска за 15 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы захад ад Варапаева, за 1,5 км на захад ад возера Лучай. Назва паходзіць ад прозвішча або мянушкі *"Кароль"* або ад імя *Караль (Карл)*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Кароль, Каралёнак, Каралёў, Каралеўскі, Каралькоў.*

Каралін*о*ва – вёска за 15 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў на левым беразе ракі Караліноўка. У 1905 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета, належала Ромэрам. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Караль* – польскай формы агульнаеўрапейскага імя *Карл.* Каралінова (раней – Каралінаў) – маёнтак, які належаў Каралю.

К*а*рпавічы – вёска за 17 км на ўсход ад Паставаў, за 6,5 км на паўднёвы захад ад Варапаева. У 1861 годзе была ў маёнтку Лучай Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Карпавіч або Карповіч*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага імя *Карп*, што ў грэчаскай мове азначае *"плод"*. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Карпей, Карпік, Карпенка, Карпаў, Карпук, Карпукоў.*

Касцян*і* – вёска за 5 км на паўночны ўсход ад Паставаў

на правым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад імя *Касцень* – формы кананічнага праваслаўнага *Канстанцін*, што ў лацінскай мове азначае *"цвёрды, пастаянны"*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Костач, Касценіч, Касцень, Касцюк, Касцюкевіч, Касцюкоў, Касцючэнка, Касцючонак, Касцючкоў.*

К*а*шыцы – вёска за 5 км на поўдзень ад Паставаў на рацэ Глодаўка. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад дыялектнага слова *"кашка"*, што азначае *"лясная расчыстка, вырубка"*. Тэрмін, напэўна, паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"kaski"* (фін., кар.) – *"выпаленае месца пад раллю"*, тэрмін падсечна-агнявога земляробства.

К*е*бнева – вёска за 10 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км на ноўдзень ад Навасёлак. Назва паходзіць ад прозвішча *Кебнеў (або Кебіч)*, якое, верагодна, утварылася ад дыялектнага заходнерускага *"кеп"* (Даль), што азначае *"хілы, нягеглы; дурны"*.

К*е*йзікі – вёска за 26 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на поўнач ад Варапаева каля ракі Заражанка. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Кейзік*, якое шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне. Прозвішча, верагодна, утварылася ад літоўскага імя *Keizis*.

В. Жучкевічам зафіксавана дыялектнае значэнне слова *"кейзік" – "малы, маларослы".*

К*е*ўлічы – вёска за 35 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 16 км на поўнач ад Варапаева каля ракі Галбіцы. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча або мянушкі *Кеўліч*, якая, верагодна, утварылася ад літоўскага *"kiaule"*, што значыць "свіння".

К*о*йры (1) – вёска за 13 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. Назва паходзіць ад прозвішча *Койра*, якое ўтварылася ад літоўскага імя *Kajrys,* што азначае "ляўша". На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Койра,*

Кайровіч.

К*о*йры (2) - вёска за 29 км на захад ад Паставаў, за 5,5 км на ўсход ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, належала Сырвіду. Тлумачэнне назвы гл. *Койры (1)*.

К*о*йры (3) – вёска за 12 км на наўднёвы захад ад Паставаў, за 2 км на поўнач ад Вярэнек. Тлумачэнне назвы гл. *Койры (1)*.

К*о*лаўцы – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на ўсход ад Дунілавічаў. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскага *"кола" – "круг"* або *"около" – "каля"* і характарызуе вёску як паселішча, якое знаходзіцца каля возера Надазерскае. Не выключана, што ў даўнейшыя часы возера называлася Кола або Колаўскае з прычыны амаль правільна выцягнутай катлавіны. У Пастаўскім раёне на адлегласці 15 км на захад ад вёскі Колаўцы ёсць возера *Колаўскае* і ўрочышча *Колава*.

К*о*саўшчына – вёска за 33 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 17 км на поўнач ад Варапаева каля ракі Паловіца. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці, належала Тызенгаўзу. Назва, верагодна, утварылася або ад фіна-ўгорскай асновы *"kosk" – "водмель", "перакат", "парог"*, або ад славянскага *"каса" - "водмель", "мыс"*. Як бачым, розныя мовы даюць сэнсава блізкія тлумачэнні. Можна меркаваць, што ўрочышча, у якім пазней з'явілася вёска, вызначалася водмелямі (косамі) на рацэ Паловіца.

К*о*ўзаны – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў, за 4,5 км на паўночны захад ад Лучая. У 1873 годзе была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Коўзан*, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі. Так называлі чалавека, які меў *коўзкую* паходку, коўзкія рухі, гэта значыць, што чалавек *хадзіў плаўна, лёгка*. На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Коўзан*.

Краск*і* – вёска за 17 км на поўдзень ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Вярэнек, за 1 км на паўночны захад ад возера Кузьмічы. Назва паходзіць ад прозвішча або імя *Краско*, якое ўтварылася ад старажытнаславянскага прыметніка

"красны" ў значэнні *"прыгожы"*. У Пастаўскім раёне ёсць шмат прозвішчаў з асновай "крас": *Краско, Красаў, Красоўскі, Красілевіч, Крашчанка.*

Кр*а***шнева** – вёска за 21 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 19 км на паўночны захад ад Варапаева каля ракі Дзісна. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць з балцкіх моў: літоўскае *"krastas"* азначае *"бераг"*, такое ж значэнне мае і латышскае *"krasts"*. Такое тлумачэнне дакладна адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць вёскі, якая ляжыць на беразе Дзісны.

Кр*о***лікі** – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на захад ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. На польскіх картах 30-х гадоў XX стагоддзя назва запісана як *Kroliki*, што дае падставы растлумачыць яе паходжанне ад польскага *"krol"* – *"кароль"*. Верагодна, у старажытнасці вёска была каралеўскім уладаннем.

Крук*і* **1-я** – вёска за 10 км на захад ад Паставаў, 5,5 км на паўночны ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Крук*, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі. *"Крук" – крывы, скручаны, сутулы або гарбаты чалавек* ("хадзіць крукам", "сагнуцца крукам"). Як верагодны варыянт можна разглядаць паходжанне прозвішча і ад польскага *"kruk"* – *"воран; крумкач"*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Крук, Крукач, Крукаў, Крукоўскі*.

Крук*і* **2-я** – вёска за 16 км на захад ад Паставаў, за 1 км на поўдзень ад Гадуцішак. У пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Крукі 1-я*.

Крутк*і* – вёска за 15 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на захад ад Варапаева. З пачатку XX стагоддзя ў Лучайскай воласці. Паходжанне назвы можна растлумачыць як з балцкіх, так і са славянскіх моў, прычым сэнсавае значэнне назвы амаль супадае. У літоўскай мове *"krutis"* – *"узвышша, узгорак, бераг"*; у рускай *"круча"* – *"пригорок, холм"*. Вёска сапраўды знаходзіцца на ўзгорыстай мясцовасці з моцна

перасечаным рэльефам.

Крыв*о*е 2-е – вёска за 33 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на ўсход ад Варапаева каля *возера Крывое*. Вядома з 1873 года ў Норыцкай воласці. Назва паселішча ўтварылася ад назвы возера, якое, сапраўды, мае вельмі складаную форму катлавіны. Да 1977 года існавала вёска Крывое 1-е, якая злілася з Крывое-2.

Крыв*ы* Мост – вёска за 14 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўночны захад ад Варапаева. Назва адлюстроўвае *асаблівасці транспартных шляхоў* і першапачаткова адносілася да ўрочышча, дзе праз рачулку быў перакінуты мост.

Кр*ы*ўка – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Варапаева. У пачатку XX стагоддзя - у Лучайскай воласці, засценак. Назва ўтворана ад прыметніка *"крывы"* і адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча паселішча: сама вёска *"крывая"*, бо знаходзіцца каля поймы невялікай ракі, якая ўтварае вялікую луку – *"крывуліну"*.

Куб*а*ркі – вёска за 12 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на левым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, належала Смігельскаму. У 1905 годзе маёнтак Хомскага на рацэ Ржаўка, засценак, вёска і выселак. Назва, верагодна, паходзіць ад літоўскага *"kubrys"*, што азначае *"узгорак, курган"*. І. Яшкін звязвае паходжанне назвы з дыялектным *"кубаркі" – зараснікі бабоўніку або капытніку.*

Кукл*я*ны – вёска за 22 км на захад ад Паставаў, за 13 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад літоўскага *"kuklus" – "сціплы, непатрабавальны"*. Такую, напэўна, характарыстыку ад мясцовых жыхароў атрымалі перасяленцы-стараверы з Расіі, якія заснавалі тут паселішча.

Кулак*о*ва – вёска за 6 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Кулакоў*, якое ўтварылася ад тэрміна *"кулак"* –

так называлі заможных сялян-уласнікаў, якія наймалі беднякоў для работы на сваёй гаспадарцы. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Кулак, Кулакоў, Кулакоўскі*.

Кундры – вёска за 13 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 4 км на ўсход ад Кураполля на левым беразе ракі Паловіца. Назва паходзіць з фіна-ўгорскіх моў: у эстонскай *"kund"* азначае *"ралля, разворванне глебы"*. На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Кундра*.

Куніцкія 1-я – вёска за 28 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 10 км на поўнач ад Варапаева на правым беразе ракі Галбяіца. У пачатку XX стагоддзя ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Куніцкі*, якое ўтварылася ад мянушкі або паганскага імя *Куніца*, дадзенага чалавеку за падабенства рыс характару з *куніцай – "невялікай драпежнай жывёлы сямейства куніцавых з каштоўным футрам"*. На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Куніцкі.*

Куніцкія 2-я – вёска за 30 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўночны захад ад Казлоўшчыны на левым беразе ракі Ласіца. Тлумачэнне назвы гл. *Куніцкія 1-я.*

Курaполле – вёска за 12 км на поўнач ад Паставаў на рацэ Лучайка. У 1905 годзе маёнтак Пшаздзецкіх і вёска ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва складаецца з дзвюх асноў: *"Кура"* – верагодна, змененае літоўскае імя *Kuris (Kuras)*, а *"полле"* – *"зямля, поле"*. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Куракова, Курачэнка, Курачонак, Кураш, Курашэвіч.*

Курды – вёска за 14 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы захад ад Лучая. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Курда*, утворанага, верагодна, ад літоўскага *"Ákurdinimas"*, што азначае *"паселішча".* У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Курда, Курдо, Курдзёнак, Курдзека.*

Курсевічы - вёска за 8,5 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы захад ад Навасёлак. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва

паходзіць ад прозвішча *Курсевіч*, якое ўтварылася ад этноніма *"куршы"* – найменне старажытна-латвійскай народнасці на захадзе Латвіі. *"Курса"* – гістарычна вобласць у Латвіі, якую насялялі раней куршы. На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Курсевіч*.

Курт*ы* – вёска за 6 км на паўночны захад ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. У 1873 годзе была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моў: у літоўскай *"kurtis"* азначае *"сяліцца, пасяляцца"*; *"kurti"* – *"будаваць"*. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Курто, Курцін, Курціноўскі.*

Кур*ы***лавічы (1)** – вёска за 39 км на ўсход ад Паставаў, за 20 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Ваўкалацкай воласці. Назва патранімічная, утворана ад прозвішча *Курыловіч*, якое мае шырокае распаўсюджанне на Пастаўшчыне. У аснове прозвішча ляжыць імя *Курыла*, якое з'яўляецца мясцовай формай кананічнага праваслаўнага імя *Кирилл (Кірыла).* У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Курыловіч (вельмі распаўсюджана), Курылёнак.*

Кур*ы***лавічы (2)** – вёска за 8 км на ўсход ад Паставаў, за 3,5 км на паўднёвы ўсход ад Юнек. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Курылавічы (1)*.

Куц*і***шкі** – вёска за 34 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 9 км на поўдзень ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"кут"* у значэнні *"вугал, куток, край"*. Вёска сапраўды месціцца на куце поля каля вялікага ляснога масіву. На Пастаўшчыне ёсць прозвішчы *Кутуць, Куцько, Куталёў, Куценкоў.*

Л

Лаз*о***вікі** – вёска за 33 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км на поўдзень ад чыгуначнай станцыі Навадруцк. Назва паходзіць ад прозвішча *Лазовік*, якое ўтварылася ад назвы расліны *"лаза"* – "кусты некаторых парод вярбы". Такую аснову ў Пастаўскім раёне маюць прозвішчы *Лазовік, Лазінскі, Лазікевіч.*

Лам*і***жына** – вёска за 10 км на паўночны ўсход ад

Паставаў, за 1 км на паўночны захад ад Навасёлак. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай валасці Вілейскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моў. Літоўскае *"lomingas"* азначае *"нізкі"*. Адсюль - ламіжына (нізкае месца).

Лапач*о***нкі** – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўночны ўсход ад Варапаева на правым беразе ракі Чэртка. Вядома з 1860 года ў Віленскай губерні. У 1905 годзе - вёска і хутар у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Лапачонак,* якая ўтварылася, верагодна, ад мянушкі *"лапатун"* – "чалавек, які многа і бесперастанку гаворыць; балбатун". На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Лапачонак, Лопанаў.*

Лапінцы – вёска за 14 км на поўнач ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Назва паходзіць ад беларускага *"лапіна"* – "мясцовасць, якая чым-небудзь вылучаецца на агульным фоне; невялікі кавалак зямлі".

Лап*о***сі** – вёска за 12 км на поўнач ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад Кураполля на правым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць з балцкіх моў, дзе *"lopas"* (літ.) – "лапіна, невялікі кавалак зямлі".

Лапун*ы* – вёска за 20 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Камаяў. У 1873 годзе - казённы маёнтак у Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад мянушкі *Лапун*, якая ўтварылася ад дзеяслова *"лапаць"* – "хапаць, мацаць рукамі". Можа быць, такую характэрную рысу мелі першажыхары вёскі. Магчыма паходжанне назвы і ад слова *"лапа"* – " ступня або нага некаторых жывёл і птушак", а таксама ў размове "нага або рука чалавека". У Пастаўскім раёне распаўсюджана прозвішча *Лапун*.

Л*а***сіца** (1) – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 12,5 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева за 1 км на захад ад возера Ласіца, каля ракі Ласіца. У 1861-65 гадах маёнтак Акушкі ў Віленскай губерні. У 1886 годзе была ў Норыцкай воласці Вілейскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад наймення ракі, у аснове якой ляжыць фіна-ўгорскае *"laas"* –

“лес”. Фармант “-іца” характэрны для вадатокаў. Такім чынам, Ласіца – лясная рэчка.

Ла*а***сіца** (2) – вёска за 33 км на ўсход ад Паставаў, за 1,5 км ад Казлоўшчыны, на ўсходнім беразе возера Ласіца. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Тлумачэнне гл. *Ласіца (1)*.

Л*а***ськія** – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Казлоўшчыны, на левым беразе ракі Ласіца. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад наймення ракі, у аснове якой ляжыць фіна-ўгорскае *"laas"* – “лес”. Ласькія – гэта тыя, што жывуць па лесе або каля ракі Ласіца.

Л*а***ўкі** – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўднёвы ўсход ад Груздава. Назва паходзіць з балцкіх моў: літоўскае *"laukas"* азначае “поле”.

Лаўр*ы***нава** – хутар за 18 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Лучая, за 1 км на поўдзень ад возера Каменскае. Назва патранімічная, паходзіць ад імя *Лаўрын* – формы праваслаўнага кананічнага імя *Лаўрэнцій*. У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Лаўрыновіч*.

Лаўц*ы* – вёска за 19 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Камаяў. У 1873 годзе вёска ў казённым маёнтку Камайскай воласці Свянцянскага павета. 16 сакавіка 2010 года рашэннем раённага Савета дэпутатаў ліквідавана. Назва паходзіць ад прозвішча *Лавец*, якое ўтварылася ад мянушкі *"лавец"* – “той, хто стала займаецца лоўляй каго-небудзь ці чаго-небудзь як промыслам”. Відаць, уладальнік гэтай мянушкі меў добрыя здольнасці да такога роду дзейнасці. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Лавец, Лоўчык*.

Лашук*і* – вёска за 32,5 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км на паўднёвы захад ад Казлоўшчыны, на правым беразе ракі Ласіца. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Лашук*. Магчыма, у яе аснове ляжыць фіна-ўгорскае *"laas"* – “лес”, з чаго вынікае, што “лашук” – “лясны жыхар”. Вёска і зараз знаходзіцца сярод вялікага лесу. У літаратуры сустракаецца

версія, што прозвішча Лашук утворана ад славянскага "лошадь" (конь). У Пастаўскім і Мядзельскім раёнах пашырана прозвішча *Лашук*.

Л*е*скава – вёска за 13 км на поўнач ад Паставаў, за 1,5 км на ўсход ад Кураполля. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва славянская, паходзіць ад асновы *"лес"*.

Л*і*паўка – вёска за 9,5 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Навасёлак. Назва паходзіць ад слова *"ліпа"* – "лісцевае дрэва сямейства ліпавых".

Л*і*пнікі – вёска за 4,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, на правым беразе ракі Мядзелка. У пачатку XX стагоддзя знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад слова *"ліпнік"* – "зараснік ліпавых дрэў".

Ліс*і*цы – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на паўднёвы ўсход ад Лучая на ўсходнім беразе возера Лісіцкае. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Лісіца*, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі, якую атрымаў чалавек за свае "лісіныя павадкі". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Лісіца, Лісоўскі, Лісовіч, Лісіцкі*.

В. Жучкевіч тлумачыць паходжанне назвы ад геаграфічнага дыялектнага *"лысіца"* ў значэнні *"бязлесая паляна, голае ўзвышша"*.

Ліцв*і*нкі – вёска за 4 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 1 км на паўночны захад ад возера Загачча. У 1873 годзе была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Назва – этнонім, паходзіць ад *"ліцвіны"* – "этнічная і гістарычная назва жыхароў ВКЛ – літоўцаў і беларусаў". У Пастаўскім раёне ад гэтай асновы ўтвораны прозвішчы *Літвін, Літвінёнак, Літвіновіч.*

Л*о*гавінцы – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў, за 0,5 км на ўсход ад ракі Лучайка. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад беларускага *"лог, логавіна"*, што азначае "нізіна; шырокі і доўгі яр".

Л*о*дасі – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў на

паўночным беразе возера Лодасі. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва вёскі паходзіць ад наймення возера: у фіна–ўгорскіх мовах: *"luodo" (кар.), "luoto" (фін.)* – "астравок", "камяністая водмель", *"lood" (эст.)* – "маленькі камяністы астравок". Геаграфія пацвярджае такое тлумачэнне: на возеры знаходзіцца востраў, які складзены пясчана–камяністым матэрыялам.

Л*о*пуці (Лапуц*і*) – вёска за 19,5 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы захад ад Камаяў, за 1 км на ўсход ад возера Лодасі. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"lap"*, *"lapos (венг.)* – "кавалак зямлі; невялікая раўніна". Блізкае значэнне мае і літоўскае *"lopas"* – "лапіна; кавалак зямлі".

Л*о*ўкішкі – вёска за 6 км на паўночны захад ад Паставаў на беразе ручая. Назва паходзіць з балцкіх моў: літоўскае *"laukas"* азначае "поле".

Луг*і* – вёска за 22,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць са славянскіх моў, утварылася ад слова *"луг"* – "сенажаць, пераважна заліўная, пакрытая шматгадовымі травяністымі раслінамі". Вакол вёскі сапраўды раскінуліся шырокія прасторы лугоў.

Лукаш*о*ва – вёска за 14,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лучая. У 1873 годзе знаходзілася ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе – вёска і засценак. Назва патранімічная, паходзіць ад каталіцкага польскага *Lukasz* або праваслаўнага кананічнага *Лука,* што азначае *"які нарадзіўся пры ўзыходзе сонца"*. Ад гэтага імя ў Пастаўскім раёне ўтварыліся прозвішчы *Лукашэвіч, Лукашонак, Лукашук.*

Луцк-Казл*о*ўскі – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўночны усход ад Казлоўшчыны. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскага тэрміна *"лука"* ў значэнні "заліў, затока". Першапачаткова

паселішча ўзнікла на беразе возера Царкавішча, каля затокі, *"пры луцэ"* пазней, за 2 км на захад, бліжэй да Казлоўшчыны, узніклі выселкі. Каб адрозніваць паселішчы між сабой да назваў дадалі прыметнікі: Луцк-Мосарскі і Луцк-Казлоўскі.

Л*у*чай – вёска за 18 км на ўсход ад Паставаў паміж азёрамі Лучай і Лісіцкае. Назва паходзіць ад наймення возера, якое ўтварылася ад геаграфічнага тэрміна *"лука"* – "звіліна", "загін рэчышча". Гэта слова ў блізкіх значэннях сустракаецца ў славянскіх, балцкіх і фіна-ўгорскіх мовах.

Л*ы*нтупы (Лынт*у*пы) – гарадскі пасёлак за 34 км на захад ад Паставаў на рацэ Лынтупка. Упершыню ўпамінаецца пад 1385 годам. З сярэдзіны XIX стагоддзя — цэнтр воласці ў Свянцянскім павеце Віленскай губерні, маёнтак ва ўладанні Юрыя Бішэўскага, нашчадкі якога валодалі ім да 1939 г. У пачатку XX ст. пабудаваны двухпавярховы мураваны палац, закладзены парк. Ёсць версія, што назва складаецца з дзвюх частак і з'яўляецца балцка-фінскай: "lyntu" (фін.) – "птушка", "upis"(літ.) – "рэчка" (Ж). Разам атрымліваецца "птушыная рака" – такі сэнс мела назва ракі Лынтупка. Іншая версія лічыць назву балцкай і выводзіць яе са спалучэння двух слоў: "lynas" – "вяроўка, шнур" і "tupas" – "след, адбітак", што дае разам "адбітак шнура" – характэрнае аздабленне керамічнага посуду, які ў вялікай колькасці знаходзіцца ў старажытным курганным комплексе каля Лынтупаў (С. Вітушка).

Ляв*о*навічы – вёска за 10 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўночны ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе былі Лявонавічы 1-я, 2-я і засценак. Назва паходзіць ад прозвішча *Лявонавіч*, якое ўтварылася ад імя *Лявон* – формы кананічнага праваслаўнага *Леонт*, *Леонтий*, што азначае "леў". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Лявонаў, Лявонавец, Левановіч*.

Ляв*о*нкі – вёска за 12 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак, уладанне Дзісько. Назва паходзіць ад імя *Лявон (Лявонка)* – формы кананічнага

праваслаўнага *Леонт, Леонтий*, што азначае "леў".

Ляхаўшчына – вёска за 31 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на ўсход ад Варапаева. Назва – этнонім, паходзіць ад слова *"лях"*, што азначае "паляк". На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Лях, Ляховіч, Ляхновіч*.

М

Мажэйкі – вёска за 6 км на паўночны захад ад Паставаў на паўночным беразе возера Мажэйкі. У пачатку XX стагоддзя была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моў ад прозвішча *Мажэйка*. У літоўскай *"mazas"* – "малы", адкуль *"мажэйка"* – "нізкарослы, невялікі чалавек". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Мажай, Мажэйка, Мажаеў, Мажукін, Мажута.*

Мазурка – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва-этнонім, паходзіць ад тэрміна *"мазуры"* – "этнаграфічная група палякаў, якая насяляла паўночна-ўсходнюю частку Польшчы". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Мазуркевіч, Мазурэвіч, Мазурскі, Мазорын*.

Макараўцы – вёска за 3 км на поўдзень ад Паставаў на правым беразе ракі Глодаўка. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад імя *Макар*, якое з'яўляецца формай кананічнага праваслаўнага *Макарий*, што азначае з грэчаскай мовы *"шчаслівы, блажэнны"*. Ад гэтага імя ў Пастаўскім раёне ўтвораны прозвішчы *Макараў, Макаранка, Макара*.

Макаршчына – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева паміж возерам Белае і ракой Чэртка. У 1873 годзе засценак ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад імя *Макар*, якое з'яўляецца формай кананічнага праваслаўнага *Макарий*, што азначае з грэчаскай мовы *"шчаслівы, блажэнны"*. Вёска ўяўляе сабой па сутнасці групу хутароў, што і падкрэсліваецца пpасторавым суфіксам "-шчына".

Малькавічы – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на паўночны ўсход ад Дунілавічаў. Назва паходзіць

ад прозвішча *Мальковіч (Малькевіч)*, якое ўтворана ад мянушкі *"малько"* у значэнні *"малы"*. Ад гэтай сэнсавай асновы на Пастаўшчыне ўтворана шмат прозвішчаў: *Малей, Малец, Малік, Малікаў, Малы, Малышаў, Малыхін, Малькевіч, Малько, Мальцаў, Маляўка.*

Ман*е*ўшчына - вёска за 25 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на поўнач ад Варапаева, на левым беразе ракі Заражанка. У 1873 годзе ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Паходжанне назвы можна растлумачыць з фіна-ўгорскіх моў, дзе аснова *"мань"* азначае "малы", "маленькі". Рака Заражанка-Галбяіца каля Манеўшчыны значна звужаецца, што, верагодна, і было заўважана старажытнымі людзьмі, якія назвалі гэты ўчастак ракі *"манья"*, што значыць "малая рака". Пазней назва была зменена славянамі, але захавала ўласцівасць абазначэння мясцовасці, бо фармант "-шчына" характарызуе аб'ект як нейкую тэрыторыю. Паселішча, якое тут узнікла, атрымала назву мясцовасці. Не менш верагодна, што назва ўтварылася ад імя *Манько* – формы кананічнага хрысціянскага імя *Мануіл*.

М*а*нькавічы – вёска за 9 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Мядзелка. Вядома з XVI стагоддзя ў Ашмянскім павеце як сяло і маёнтак Шэметаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, маёнтак і сяло князя Друцкага-Любецкага. Назва паходзіць ад прозвішча *Маньковіч*, якое ўтварылася ад імя *Манько* – формы кананічнага хрысціянскага імя *Мануіл*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Манькоўскі, Манкевіч*.

Мар'янп*о*лле – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на захад ад Лучая. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва складаецца з дзвюх частак. Першая паходзіць ад імя *Мар'ян* – формы кананічнага хрысціянскага *Марыян (Marian).* Другая азначае раллю, палеткі. Такім чынам, назва ўрочышчы гучала як *"Мар'янава поле".*

Марач*ы* – вёска за 21 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на поўдзень ад Камаяў, за 1 км на поўнач ад возера В. Швакшты. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці

Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"марочна, марачына"* ў значэнні "балота, твань; забалочаная мясцовасць". Тэрмін ужываецца пры характарыстыцы глухіх змрочных балот, дзе "не косяць траву, а толькі збіраюць журавіны". На поўдзень ад вёскі сапраўды ляжыць вялікае балота. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Марачкоўскі, Маракін.*

Мартул*і* – вёска за 37 км на ўсход ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Мартуль*, якое ўтварылася ад кананічнага хрысціянскага імя *Марцін (Мартын)*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Марцін, Марцінкевіч, Марціновіч, Мартуль, Мартыненка, Мартынаў, Мартыновіч, Мартысюк.*

Марцін*е***левічы** – вёска за 38 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 14 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Марцінелевіч*, якое ўтварылася ад імя *Марцінель* – формы кананічнага хрысціянскага імя *Марцін (Мартын)*.

Маск*а***лішкі** – вёска за 15 км на поўнач ад Паставаў у сутоках рэк Мядзелка і Лучайка. Назва-этнонім. Раней *маскалямі* ў Вялікім Княстве Літоўскім называлі выхадцаў з Маскоўскай дзяржавы, рускіх. Верагодна, перасяленцы з суседняй краіны аселі ў сярэднявеччы на беразе тады яшчэ суднаходнай ракі Мядзелка. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Маскалёў, Маскалевіч*, *Маскаленка.*

М*а***сленікі** – вёска за 37 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на поўдзень ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, уваходзіла ў маёнткі Гейбішкі і Багданішкі, належала Юрыю Бішэўскаму. Верагодна, назва паходзіць ад прозвішча *Масленік*, якое ўтварылася ад занятку жыхара: *масленік* – чалавек, які займаўся вырабам масла. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Маслій, Маслаў, Маслоўскі, Маслюк.*

Маст*ы* – вёска за 35 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 5 км на поўнач ад Казлоўшчыны. Назва адлюстроўвае асаблівасць транспартных шляхоў. Вакол вёскі знаходзіцца

некалькі ручаёў – вытокаў ракі Плісаўка, праз якія былі пакладзены *масткі*.

Масц*і*шча – вёска за 22 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на захад ад Дунілавічаў. У 1873 годзе ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Назва адлюстроўвае асаблівасць транспартных шляхоў і паходзіць ад беларускага дзеяслова *"масціць"* – "рабіць насціл з дошак, бярвення; брукаваць дарогу".

Мац*е*йкі (1) – вёска за 24 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Белек каля ракі Паловіца. У 1873 годзе засценак ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад прозвішча *Мацейка*, якое ўтворана ад кананічнага хрысціянскага *Матфей (Мацвей, Мацей)*, што ў яўрэйскай мове азначае *"чалавек Божы"*. Імя ўтварае шмат форм, якія сталі асновай шматлікіх прозвішчаў жыхароў Пастаўшчыны: *Мацкевіч, Мацук, Мацур, Мацюк, Мацеша*.

Мац*е*йкі (2) – вёска за 40 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 16 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Мацейкі (1).*

Мацк*о*вічы – вёска за 17 км на захад ад Паставаў, за 3,5 км на наўночны захад ад Камаяў. У 1905 годзе - маёнтак у Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Мацковіч*, якое ўтварылася ад імя *Мацко* – формы кананічнага хрысціянскага *Матфей (Мацвей, Мацей)*, што ў яўрэйскай мове азначае *"чалавек Божы".* У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Мацкевіч, Мацук, Мацур, Мацюк, Мацеша*

Мацур*ы* – вёска за 14 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўночны захад ад Лучая. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад імя або прозвішча *Мацур* – формы кананічнага хрысціянскага *Матфей (Мацвей, Мацей)*, што ў яўрэйскай мове азначае *"чалавек Божы".* Прозвішча *Мацур* распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Мац*у*ты – вёска за 8 км на паўднёвы захад ад

Паставаў, за 1 км на захад ад Дварчанаў. Назва паходзіць ад мянушкі *"мацак, мацута"*, што азначае "моцны, дужы, здаровы чалавек".

Мікулкі – вёска за 26 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў на паўночным беразе возера Саранчаны. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад імя *Мікула* – формы кананічнага хрысціянскага імя Мікалай, што азначае *"пераможца народаў" і "народны герой"*. Ад яго на Пастаўшчыне ўтварылася шмат прозвішчаў: *Мікуліч, Мікула, Мікульскі, Нікалаеў, Нікалаенка, Нікаленка.*

Мірклішкі – вёска за 21 км на захад ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Гадуцішак, каля ракі Камайка. Назва, верагодна, паходзіць з балцкіх моў, дзе літоўскае *"merka"* азначае "стаў, сажалка; вільгаць". Блізкае па значэнні і *"mirkti"* – "мокнуць".

Міськія – вёска за 4,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на паўднёвы захад ад Юнькаў. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад імя або прозвішча *Місько*, якое з'яўляецца формай кананічнага хрысціянскага *Міхаіл*, што значыць *"роўны Богу, як Бог"*. В. Міхасёнак, настаўнік і паэт, ураджэнец гэтай вёскі, пісаў, што першапачаткова яна называлася *Мнішкі* і тлумачыў яе паходжанне ад слова *"мніх"* – "манах". Вось як ён піша: *"Там, дзе, як далонь, раўніна, што распрасцёрлася на поўдзень ад Паставаў, за кіламетры чатыры па дарозе на Савічы пачынае пераходзіцьу хвалістыя маляўнічыя ўзгоркі, на левым беразе колісь паўнаводнай рэчкі Рудзіцы - прытоку Лучайкі - і ўзнікла гэтая вёска з цікавай назвай Мнішскія. Яшчэ не так даўно ў пашпартах і метрыках яе жыхароў стаяла: нарадзіўся ў в. Мнішскія. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага "мніх", што азначае манах. А людзі, што адбывалі павіннасць на манастырскіх землях, і былі мнішанскія. Калі ў мінулым стагоддзі была забаронена ўніяцкая рэлігія, асабліва пасля падаўлення паўстання 1863 года, былі зачынены манастыры, а землі, што належалі ім, перададзены дзяржаве, то і сяляне сталі дзяржаўнымі, ці, як самі*

старажылы памятаюць, называлі іх казённымі ў параўнанні з суседняй вёскай Будзева, якая была панская. Такое паходжанне вёскі і сялян. З цягам часу разбураліся сцены храма, што стаяў бліз вёскі ва ўрочышчы Конава або Манастыршчына, паступова змяніла сваё гучанне і назва вёскі". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Міснік, Місуна*.

Міхал*і*на – вёска за 27 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 4 км на поўдзень ад Дунілавічаў на рацэ Заражанка. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе фальварак Карэцкага. Назва паходзіць ад імя *Міхал* – формы кананічнага хрысціянскага *Міхаіл*, што азначае *"роўны Богу, як Бог"*. У Пастаўскім раёне ўтварылася шмат прозвішчаў ад гэтага імя: *Міхалевіч, Міхайлаў, Міхайлоўскі, Міхаловіч, Міхаленка, Міхаль.*

М*і*хнічы – вёска за 8 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 10 км на захад ад Лучая. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад імя або прозвішча *Міхно*, якое ўтворана ад кананічнага хрысціянскага *Міхаіл*, што азначае *"роўны Богу, як Бог"*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Міхневіч, Міхнёнак, Міхно, Міхновіч.*

Міцк*я*ны – вёска за 22 км на паўднёвы захад ад Паставаў на паўночным беразе возера М. Швакшты. Назва паходзіць ад прозвішча або імя *Міцько* – формы кананічнага праваслаўнага імя *Дмитрий*, каталіцкага польскага *Demetriucz, Dymitr*, што азначае *"плод зямны"*. На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Міцэвіч*.

М*о*льдзевічы – вёска за 12 км на захад ад Паставаў на рацэ Лігума на мяжы з Летувой. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Мольдзевіч*, якое ўтварылася ад літоўскага імя *Мальдзіс (Maldingas)*, што азначае *"набожны, багамольны"*.

М*у*ляры – вёска за 15 км на захад ад Паставаў, за 6 км на поўнач ад Камаяў. У 1898 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе называлася Муляры Польныя, належала фон Эксе. Назва адлюстроўвае заняткі жыхароў: *муляр* – "чалавек, які будуе што-небудзь з

каменя або цэглы; пячнік”. Прыметнік “польныя” мае значэнне “адкрытыя; у полі” супрацьпастаўляючы з Мулярамі Ляснымі. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Муляр, Муляронак*.

М*у*ляры Лясныя – вёска за 9 км на паўночны захад ад Паставаў, за 9 км на ўсход ад Гадуцішак. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Муляры*.

М*у*мішкі – вёска за 15 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе засценак Мумішкі, або Казлы. Аснова назвы ўтварылася ад літоўскага слова *"miskas"* – “лес”.

М*у*нцавічы – вёска за 12 км на захад ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы ўсход ад Гадуцішак. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва, верагодна, паходзіць ад прозвішча *Мунцавіч (Манцэвіч)*, якая ўтварылася ад імя *Мунька* – формы кананічнага хрысціянскага імя *Мануіл*.

М*ы*шкі – вёска за 24 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева на правым беразе ракі Заражанка. У 1781 годзе была ў маёнтку Дунілавічы Ашмянскага павета, сяло. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Мышко*, якое шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне.

Мяг*у*ны – вёска за 20 км на захад ад Паставаў, за 6 км на захад ад Камаяў на заходнім беразе возера В. Сурвілішкі. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета, уладанне Чаховіча. Назва, верагодна, паходзіць з фіна-ўгорскіх моў: у эстонскай *"мягі"* азначае “гара”, таксама і фінскае *"maki"*. Магчымы варыянт паходжання і ад славянскай: украінскае *"магура"* – “гара”. Мясцовая версія звязвае назву з даўнімі магіламі.

М*я*дзелка – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на захад ад Варапаева. У 1873 годзе ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Назва вёскі паходзіць ад наймення ракі і мае фіна-ўгорскія карані:

"mets"(эст.), "metce" (фін.) – "лес", *"ель"* (комі) – "лясны ручай, рэчка". Фармант "-ка" характэрны для паселішчаў. Такім чынам, Мядзелка – гэта вёска на беразе ракі Мядзель або Мядзеліца, што азначае "лясная рэчка".

Мяст*э*чка – вёска за 8 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад Манькавічаў. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, належала Хлявінскай. *Мястэчка* – гістарычны тып паселішчаў у Беларусі, "вялікае сяло з некаторымі прыкметамі горада".

Н

Навадр*у*цк – чыгуначная станцыя каля аграгарадка Парыж за 34 км на ўсход ад Паставаў, за 11 км на ўсход ад Варапаева. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва з'явілася ў канцы XIX стагоддзя, калі тут была пракладзена чыгунка Новясвянцяны-Беразвечча і збудавана чыгуначная станцыя, названая *ў гонар князя У. Друцкага-Любецкага*, які прычыніўся да будаўніцтва чыгункі і рэстаўрацыі царквы ў суседняй вёсцы Асінагарадок.

Навасёлкі (1) – вёска за 11 км на ўсход ад Паставаў, за 12 км на захад ад Варапаева. Паселішча ўтворана перасяленцамі з другой ("старой") вёскі, што і адлюстравалася ў назве: *"навасёлкі"* – "новае сяло, новае паселішча".

Навасёлкі (2) – вёска за 22 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Навасёлкі (1).*

Навасёлкі (3) – вёска за 25 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 9 км на захад ад Белек на правым беразе Дзісны. У пачатку XX стагоддзя была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Навасёлкі (1).*

Навасёлкі (4) – вёска за 25 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы захад ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Тлумачэнне назвы гл. *Навасёлкі (1).*

Навік*і* – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўднёвы захад ад Казлоўшчыны на паўднёвым беразе возера Навікі. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці

Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад тэрміна *"навіна, новь"* у значэнні "неараная зямля, раскарчаваны лес, цаліна" і адлюстроўвае працэс падсечна-агнявога земляробства.

Нав*і*нкі – вёска, цэнтр рыбгаса "Навінкі", за 34 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 6 км на поўнач ад Казлоўшчыны. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. У 1905 годзе фальварак Навіна. Тлумачэнне назвы гл. *Навікі.*

Надаз*е*р'е – вёска за 14,5 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на захад ад Лучая, за 1 км на захад ад возера Лучай. Назва характарызуе асаблівасць геаграфічнага становішча паселішча: яно ляжыць *"над возерам"*.

Нар*у*шышкі – хутар за 30 км на захад ад Паставаў, за 3 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад імя *Наруш або Нарус.* У літоўскай мове *"narus"* азначае "лёгкі". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Наруць, Нарушэвіч*.

Невяд*о*мшчына (да 1945 г. *Брэскія*) – вёска за 32 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны ўсход ад Белек. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва, верагодна, паходзіць ад прозвішча *Невядомскі*, якое сустракаецца на Пастаўшчыне.

Нев*я*рышкі – вёска за 30 км на захад ад Паставаў, за 11 км на поўнач ад Лынтупаў на левым беразе ракі Свіла. Назва паходзіць ад прозвішча *Нявера*, якое, верагодна, утварылася ад адпаведнай мянушкі. *Нявера* – той, хто не верыць. На Пастаўшчыне ёсць прозвішчы *Невяроўскі, Невярковіч*, у Мядзельскім раёне – *Нявера*.

Н*е*жалішкі – вёска за 35 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на поўдзень ад Лынтупаў на рацэ Язвінка. Назва, верагодна, паходзіць ад літоўскага *"nezalingas"* – "бясшкодны".

Н*о*вае З*а*ўлічча – вёска за 39 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 15 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета былі вёскі Заўлічча і Новае Заўлічча, якія зліліся ў адну ў 1988 годзе. Назва, верагодна, уяўляе сабой скажонае *"завалочча, заўлочча"* і характарызуе вёску як паселішча, якое

знаходзіцца *"за волакам"* – у мясцовасці, дзе раней па сушы перацягвалі караблі з аднаго вадаёма ў другі. Вельмі можа быць, што назва падказвае месцазнаходжанне старажытнага воднага гандлёвага шляху паміж басейнамі рэк Віліі (Нёмана) і Дзісны (Заходняй Дзвіны), які праходзіў каля вёскі Гарадзішча паміж рэкамі Сэрвач і Заражанка.

Н*о*вы Двор – вёска за 4 км на захад ад Паставаў, за 1 км на захад ад возера Задзеўскае. Назва паказвае, што паселішча ўзнікла як выселкі і яго заснавальнікамі былі, верагодна, былыя жыхары *Задзеўя ("старога двара")*.

Н*о*выя Ясн*е*вічы – вёска за 25 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на поўнач ад Дунілавічаў. У 1905 годзе існавалі фальварак Ясеневічы, які належаў Набельскай, і маёнтак Ясеневічы, ці Свідна, які належаў Янішэўскаму. Знаходзіліся ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Ясеневіч*, якое ўтварылася ад назвы *"ясень"* – "дрэва сямейства маслінавых з перыстым лісцем і цвёрдай драўнінай". На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Ясінскі*.

Н*о*ркавічы – вёска за 10,5 км на захад ад Паставаў, за 7,5 км на паўночны ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча Норка, якое ўтварылася ад літоўскага прозвішча *Norkus*, якое, верагодна, паходзіць ад *"norintis"*, што азначае "паляўнічы". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Наркевіч-Ёдка, Норкін*.

Н*о*рыца – вёска за 31 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на ўсход ад Дунілавічаў. Вядома з XVIII стагоддзя як уладанне Сулістроўскіх, пазней належаў Лапацінскім, Акушкам. У 1861 годзе – маёнтак Норжыца ў Віленскай губерні, у 1886 годзе цэнтр Нарыцкай воласці. Назва вёскі, верагодна, пайшла ад наймення рачулкі, якая праз яе працякае, ўтвараючы некалькі даволі шырокіх плёсаў, якія пазней былі перароблены ў ставы. У аснове назвы ляжыць літоўскае *"nara"* – "паток, загін ракі, меандра".

Н*о*хаўшчына – хутар за 16 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў на рацэ

Караліноўка. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе засценак Ромэра. Дакладна растлумачыць паходжанне назвы пакуль немагчыма. Можна выказаць меркаванне, што яна ўтварылася (па аналогіі з Нагаўкамі і Нагаўшчынай – вёскамі ў Мядзельскім раёне) ад славянскага *"нагой"* у значэнні "голы". Магчыма і нохаўшчына – гэта "голае месца".

О

***О*льшнева** – вёска за 29 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3,5 км на паўднёвы ўсход ад Белек. Назва паходзіць ад славянскага тэрміна *"ольс"*, што азначае "чорнаальховы лес, балота з зараснікам вольхі, часткова бярозы".

***О*цкавічы** – вёска за 13 км на захад ад Паставаў, за 5 на поўнач ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча *Оцкавіч*, якое ўтварылася, магчыма, ад імя *Оцка (Вайцех?)*.

П

Пагарц*ы* – вёска за 12 км на ўсход ад Паставаў, за 5 км на поўдзень ад вёскі Навасёлкі. Вядома з 1873 года як вёска ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"гара"*. Пагарцы – гэта паселішча, якое размешчана на узвышшы, *"па гары"*.

Пад'*я*сенка – вёска за 45 км на захад ад Паставаў, за 5 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў на ўзгорку каля невялікага ручая. Назва мае славянскае паходжанне ад наймення дрэва *"ясень"*. Гэта адметны від дрэў, які сустракаецца ў тутэйшай мясцовасці даволі рэдка, таму для мясцовых людзей служыў добрым арыенцірам. Ад дрэва ўзнікла назва ўрочышча *"Ясенка"*, а пазней – і вёскі. Прыстаўка "пад-" мае значэнне "перад, каля" і акрэслівае геаграфічнае становішча вёскі.

Падал*я*ны – вёска за 11 км на поўдзень ад Паставаў, за 1 км на захад ад возера Чэцверць. Назва мае славянскае паходжанне і адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча: *"дол"* мае значэнні "даліна, нізіна". Вёска сапраўды

знаходзіцца ў лагчыне паміж узгоркамі Свянцянскіх град, *"па долу"*.

Падаляхн*і*шкі – хутар за 13 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча: хутар знаходзіцца за 1 км на захад ад вёскі Аляхнішкі (гл. *Аляхнішкі*).

Падвішн*я*к – вёска за 26 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 1 км на поўдзень ад возера Лодасі. Вядома з 1905 года як вёска Падвішнякі (уладальнік Схолін) і фальварак (уладальнік Сарока). Назва паходзіць ад славянскай асновы *"вішняк"* – "вішні, вішнёвыя дрэвы". Прыстаўка "пад-" акрэслівае геаграфічнае становішча ўрочышча – *"каля вішняку"*.

Падляв*о*навічы – вёска за 9 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Камаяў. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча: вёска знаходзіцца за 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Лявонавічы, г.з. *"каля Лявонавіч"*, *"пад Лявонавічамі"*. Тлумачэнне назвы гл. *Лявонавічы.*

Падс*о*сна – хутар за 17 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3,5 км на поўдзень ад Камаяў. Назва адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча: хутар знаходзіцца ва ўрочышчы каля адметнай сасны, *"пад сасной"*.

Пал*е*ссе – вёска за 50 км на захад ад Паставаў, за 8 км ад Лынтупаў. Вядома з 1640 года, калі ў паселішчы была пабудавана капліца. У XIX – пачатку XX стагоддзяў належала Кубліцкім і Тышкевічам. Назва мае славянскае паходжанне і адлюстроўвае асаблівасць геаграфічнага становішча вёскі: яна ўзнікла сярод лесу – *"па лесе"*.

Палх*у*ны – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў каля вытокаў забалочанага ручая. Вядома з 1873 года як паселішча ў Свірдунскім таварыстве Лынтупскай воласці, якое належала Рынтаўтам. Назва, верагодна, паходзіць з балцкіх моў ад асновы *"palios"* (літ.) – "балота".

Пап*о*ўцы – вёска за 34 км на паўднёвы захад ад Паставаў на паўднёва-заходнім беразе возера Малыя

Швакшты. Назва ўтворана ад славянскай асновы *"поп"* – "святар". *Папоўцы* – гэта адна з плыняў у стараверстве, якая найбольш блізкая да афіцыйнай праваслаўнай царквы. Верагодна, вёска была заснавана раскольнікамі, якія перасяліліся з Расіі ў ВКЛ ў XVIII стагоддзі. На Пастаўшчыне існуе некалькі арэалаў рассялення старавераў (Апідамы, Кукляны, Лучай, Белькі).

Пар*а*скі – вёска за 9 км на поўдзень ад Паставаў на беразе возера Доўжа. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва мае славянскае паходжанне, верагодна, ад беларускага слова *"параснік"* – "маладыя парасткі дрэў або іншых раслін". Магчыма, гэты славянскі тэрмін утварыўся ад фіна-угорскай асновы *"рас"* – "гай, дробны лісцевы лес, малады бярэзнік".

Паст*а*вы – горад у паўночна-заходняй частцы Беларусі, за 10 км ад мяжы з Літвой, адміністрацыйны цэнтр раёна. У старажытныя часы на месцы сучасных Паставаў знаходзілася невялікая вёска пад назвай "Пасаднік", якая ўпершыню згадваецца пад 996 годам. У 1409 годзе ўладальнік мястэчка Зяновіч атрымаў ад Вялікага князя Літоўскага грамату на перавод вёскі ў разрад невялікіх гарадоў з наданнем ёй назвы "Паставы".

Такім чынам, горад мае дзве гістарычныя назвы. Першая –*"Пасаднік"* –утворана была з прычыны таго, што землі, на якіх знаходзілася паселішча, ляжалі на заходніх межах Полацкага княства і тутэйшай мясцовасцю кіраваў *пасаднік – намеснік полацкага князя.* Пасадам таксама называлася *гандлёва-рамесная частка горада*, якая звычайна знаходзілася на беразе ракі.

Пры пераводзе вёскі ў разрад мястэчак паселішча атрымала і новую назву - Паставы. Тлумачэнняў сэнсавага значэння назвы існуе многа, аднак ні адна з версій пакуль што не можа быць прызнана абсалютна дакладнай. Мясцовы жыхары часцей за ўсё прыводзяць два варыянты тлумачэння. Першы зыходзіць з таго, што горад амаль усю сваю гісторыю развіваўся як вайсковы і большасць яго жыхароў жыла *"па ўставу"*, адсюль, маўляў, і пайшла назва. Другі варыянт

грунтуецца на тым, што ў цэнтры горада знаходзяцца два вялікія *вадасховішчы–ставы,* і таму лагічным было ўзнікненне назвы горада як паселішча, якое размяшчаецца абапал ставоў. Гэта версія прыдатна адлюстроўвае адну з галоўных геаграфічных асаблівасцяў Паставаў.

Аднак існуюць і іншыя варыянты. Напрыклад, слова *"пастаў"* азначае *пару жорнаў у млыне,* якія выкарыстоўваліся для памолу збожжа. Крыніцы сведчаць, што пастаўскі вадзяны млын меў два паставы.

Як адзін з верагодных варыянтаў тлумачэння можа быць прынятая версія І. Зямчонка аб паходжанні назвы "Паставы" ад тэрміна, які ўжываўся пры апрацоўцы драўніны. *"Пастаў"* – гэта *група піл на лесапільных рамах*, якія ўстаноўлены ў адпаведнасці са схемай раскрою бярвення. Калі ўлічыць, што яшчэ ў часы Зяновічаў на беразе ракі Мядзелкі стаяла лесапілка, то вельмі верагодна, што і назва "вырасла" адсюль.

Як бачым, версій паходжання назвы існуе некалькі, але амаль усе яны так ці інакш звязаны з ракой Мядзелкай, якая стала калыскай Паставаў.

Пат*а*шня – вёска за 23 км на захад ад Паставаў, за 11 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў на беразе ракі Яновіца. Назва адлюстроўвае занятак мясцовых жыхароў: *паташня* – гэта месца, дзе выпальвалі *паташ* – рэчыва ў выглядзе белага зярністага парашку са шчолачнымі ўласцівасцямі, якое атрымліваецца з попелу. Тэрмін паходзіць ад *"potash"* (англ.) ("pot" – "гаршчок" + "ash(es)" – "попел") – тэхнічная назва карбанату калію, які ўжываецца пры вытворчасці шкла, мыла, для фарбавання.

Паўкшт*э*лы – вёска за 24 км на захад ад Паставаў, за 10 км на ўсход ад Лынтупаў каля ракі Яновіца. Назва паходзіць ад прозвішча *Паўкштэла*, якое ўтварылася ад літоўскага *"paukstis"* – "птушка". У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы *Паўкштэла, Паўштэла*.

Паўл*ю*гі – вёска за 31 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 14 км на поўнач ад Варапаева на беразе ракі Голбіца. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета як уладанне Тызенгаўзаў. Назва патранімічная,

паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *Павел*, што з лацінскай мовы перакладаецца як “малы, невялікі”. У дадзеным выпадку адбылася трансфармацыя імя: Павел – Паўла – Паўлюк – Паўлюга. Ад імя Павел на Пастаўшчыне ўтворана шмат прозвішчаў: *Павалковіч, Павялковіч, Паўлаў, Паўленка, Паўловіч, Паўлоўскі, Паўлюк, Паўлюкоў, Паўлючэнка.*

П*а*цкавічы – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Аржоўка. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *"Пац"* – вядомага ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай магнацкага роду, які валодаў вялікімі маёнткамі на абсягах сучаснай Беларусі. Некаторы час Пацам належалі Паставы, Манькавічы, Лучай. Верагодна, першажыхары вёскі нейкім чынам былі звязаны з *Пацамі*, магчыма, служылі ў іх.

П*а*шкава – вёска за 16 км на паўночны ўсход ад Паставаў каля ракі Паловіца. Вядома з 1873 года як засценак Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Назва патранімічная, паходзіць ад *Паша* – формы кананічнага хрысціянскага імя *Павел*, што з лацінскай мовы перакладаецца як “малы, невялікі”. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Пашко, Пашкоў, Пашкевіч, Пашкоўскі.*

Пеляк*а* – вёска за 47 км на захад ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў каля ракі Пеляка. Вядома з 1873 года як паселішча маёнтка Раманішкі, якім валодаў Ксаверы Даўгяла. У 1905 годзе тут быў флігель, зімоўе і вадзяны млын. Назва паходзіць з балцкіх моў, у якіх *"pelke"* (літ.) – “балота”.

Перав*о*зьнікі – вёска за 5 км на ўсход ад Паставаў каля ракі Лучайка. Вядома з 1873 года як вёска Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Назва мае славянскія карані і адлюстроўвае занятак мясцовых жыхароў. Вёска ўтварылася на месцы, дзе ў даўнейшыя часы існаваў *"перавоз"* – пераправа праз раку Лучайка на лодках. *Перавознік* – чалавек, які займаўся перавозам.

Перасл*е*га – вёска за 38 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Дунілавічы, за 1 км на

паўночны ўсход ад возера Баравое. Назва мае славянскія карані, утварылася ад беларускага дзеяслова *"пераслаць"* ("перасцяліць") у значэнні "пералажыць нанава", "зрабіць новы насціл". *Пераслега* – месца, дзе была насцелена гаць або масток праз балота. Сапраўды, пасярэдзіне вёску перасякае забалочаная лагчына з невялікім ручаём, праз які і магла быць пераслега.

П*е*трышкі – хутар за 42 км на захад ад Паставаў, за 2 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. Вядомы з 1873 года як засценак маёнтка Раманішкі Ксаверыя Даўгялы. Назва балцкая, патранімічная, утварылася ад уласнага літоўскага імя *Петрас (Пятрас, Пётр)*, што ў грэчаскай мове азначае "камень, скала, уцёс". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Петрушкевіч, Петрусевіч*.

П*е*шкаўцы – вёска за 50 км на захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў на высокім узгорку. Вядома з 1790 года як вёска ў 55 дымоў Лынтупскай воласці Завілейскага павета, уваходзіла ў Лынтупскі маёнтак. Назва паходзіць са славянскіх моў і адлюстроўвае асаблівасці мясцовых грунтоў. Аснова ўтворана ад слова *"пясок"*. Першапачаткова, верагодна, назва гучала як Пескаўцы, але пазней трансфармавалася ў Пешкаўцы.

Піскун*ы* – вёска за 33 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 10 км на поўнач ад в. Казлоўшчына на правым беразе ракі Галбяіца за 1 км на захад ад ставоў рыбгаса "Навінка". Вядома з пачатку XX стагоддзя як вёска Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць, верагодна, ад мянушкі першажыхароў. *Піскун* – той, хто многа пішчыць. Магчыма сувязь назвы вёскі з *рыбай уюн*, якую на Пастаўшчыне часцей называюць "піскун". У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Піскуновіч*.

Пл*а*ксы – вёска за 14 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Аржоўка. Вядома з 1873 года як вёска Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Тызенгаўзаў. Верагодна, назва паходзіць ад мянушкі першажыхароў: *"плакса"* – чалавек, які любіць скардзіцца, наракаць, плакацца. На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Плаксееў*.

Плешкун*ы* – вёска за 33 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 11 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Дунілавічы. Вядома з 1873 года ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"плеш, плешына"*, якая мае два значэнні: 1) голае месца сярод поля, лесу; 2) месца на галаве, дзе не выраслі або вылезлі валасы, лысіна. Абодва варыянты могуць разглядацца ў якасці крыніцы ўтварэння назвы. Магчыма яе паходжанне ад мянушкі першажыхара: *"пляшкун"* – чалавек з плешынай (лысінай) на галаве (прыгадаем беларускія формы: маўчун, храпун, таўстун і г. д.). Нельга выключаць і магчымае паходжанне назвы з літоўскай мовы, дзе *"plesinys"* азначае "высечанае месца ў лесе", "разараны луг", што сэнсава звязана са славянскім *"плешына"* – "голае месца на зямлі, дзе няма расліннасці". Ад асновы "плеш" на Пастаўшчыне ўтвораны шэраг прозвішчаў: *Пляшкоў, Пляшак, Пляшкун, Плешавеня.*

П*о***жарцы** – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў каля ракі Аржоўка. Вядома з 1878 года як вёска ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць са славянскіх моў ад асновы *"жар"* – "гарэлы лес", "выпаленае пад раллю месца ў лесе". Тэрмін адлюстроўвае форму падсечна-агнявога земляробства. Славяне, якія каланізавалі тутэйшую тэрыторыю, пасяліліся на *"пожары"* – месцы, якое было выпалена сярод лесу.

П*о***лава** – вёска за 29 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 18 км на поўнач ад Варапаева на беразе ракі Дзісна. Вядома з сярэдзіны XVI стагоддзя ў складзе ВКЛ. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзам. Назва паходзіць ад славянскага тэрміна *"палой"* у значэнні "пойма, нізкі бераг ракі, заліўны луг". Гэтыя вызначэнні добра стасуюцца з геаграфічнай асаблівасцю вёскі: яна на нізкай Дзісненскай нізіне на беразе ракі Дзісна, на пойме.

П*о***пелікі** – вёска за 43 км на захад ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Лынтупаў на беразе ракі Пеляка. Вядома з 1905 года як засценак Лынтупскай воласці. Назва ўтворана ад наймення ракі і азначае *"паселішча каля ракі Пеляка"*. Найменне ж ракі мае балцкую аснову *"pelke"* (літ.),

што азначае “балота, дрыгва, мокры луг”

Прамышляды – вёска за 14 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 4 км на поўнач ад вёскі Навасёлкі. У пачатку XX стагоддзя вядома як засценак у Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць са славянскіх моў. У яе аснове ляжыць старадаўні тэрмін падсечна-агнявога земляробства *“ляды”* – “месца ў лесе, якое расчышчана пад раллю”. Першапачатковая мясцовасць, дзе зараз знаходзіцца вёска, называлася *“паміж лядамі”*, але пазней тапонім сказіўся і атрымаліся “прамышляды”.

Пруднікі – вёска за 16 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўночны захад ад Варапаева на рацэ Шурыца. Вядома з 1847 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць са славянскіх моў ад асновы *“пруд”* у значэнні “стаў, запруда”.

Прусы – вёска за 33 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад вёскі Казлоўшчына каля ракі Ласіца. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва-этнонім паходзіць ад наймення групы балцкіх плямён, якія насялялі частку паўднёвага ўзбярэжжа Балтыйскага мора. У XIII стагоддзі былі заваяваны Тэўтонскім ордэнам. На месцы, дзе жылі *прусы*, пазней утварылася дзяржава *Прусія*. Утварэнне назвы вёскі можна звязаць з прозвішчам першапасяленца. У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Прус*.

Пустошка – хутар за 21,5 км на захад ад Паставаў, за 5,5 км на захад ад Гадуцішак. Назва паходзіць ад славянскага тэрміна *“пустошь, пустоша”* у значэнні “бязлюднае ўрочышча, неапрацаваная зямля”.

Пухаўка – вёска за 12 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на захад ад Лучая. Назва паходзіць ад беларускага *“пухкі”*, што азначае “мяккі”. Пухаўка – гэта мясцовасць з мяккімі землямі. Сустракаецца і дыялектнае *“пухлец” – “рыхлая зямля светлага колеру, шэра-белая глеба”.*

Пуцькава – вёска за 17 км на ўсход ад Паставаў, за 6 км на захад ад Варапаева. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Пуцька (Пуцята)*, якое ўтворана ад вызначэння *“путны”*

– “дзелавы, талковы чалавек; майстар”.

Пуц*я*цішкі – вёска за 19 км на захад ад Паставаў, за 5 км на паўночны захад ад Камаяў на ўсходнім беразе возера Вялікае Сурвілішскае. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Пуцька (Пуцята)*, якое ўтворана вызначэння *"путны"* – “дзелавы, талковы чалавек; майстар”.

Пушкар*ы* – вёска за 14 км на паўночны ўсход ад Паставаў на паўночным беразе возера Бярозаўка. Вядома з 1873 года як уладанне Тызенгаўзаў у Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва ўтварылася ад мянушкі першажыхара. Верагодна, ён атрымаў яе пасля службы ў войску: *"пушкар"* – чалавек, нейкім чынам звязаны з гарматамі; артылерыст.

П*у*шча – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад славянскага *"пушча"* – “густы лес, лясны гушчар”.

Пятр*а*гі – вёска за 11 км на паўночны ўсход ад Паставаў. Вядома з 1718 года як сяло. Назва патранімічная, паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *"Пётр"* – “камень, скала” (лац.). Асновай магло быць як беларускае “Пятро”, так і літоўскае “Пятрас”.

Пятр*о*вічы (1) – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км ад вёскі Дунілавічы каля ракі Заражанка. Назва паходзіць ад прозвішча Пятровіч, якое ўтварылася ад кананічнага хрысціянскага імя *"Пётр"*, што ў лацінскай мове азначае “камень, скала”. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад імя Пётр: *Пятровіч, Пятроў, Пятроўскі, Пятраніс, Петрачэнка, Петрусевіч, Петрушкевіч, Пятрушын, Петракоў.*

Пятр*о*вічы (2) – вёска за 33 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 19 км на поўнач ад Варапаева на беразе ракі Дзісна. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзам. Тлумачэнне назвы гл. *Пятровічы (1)*.

Пятр*о*вічы (3) – вёска за 37 км на ўсход ад Паставаў, за 11 км на ўсход ад Дунілавічаў. Тлумачэнне назвы гл. *Пятровічы (1)*.

Пятр*о*вічы (4) – вёска за 23 км на захад ад Паставаў, за 8,5 км на паўночны захад ад Камаяў. Тлумачэнне назвы гл. *Пятровічы (1)*.

Пятр*о*ўшчына – вёска за 12 км на поўдзень ад Паставаў на беразе ракі Мядзелка. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва патранімічная, паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *"Пётр"* – "камень, скала" (лац.). Фармант "-шчына" сведчыць пра тое, што назва спачатку адносілася да пэўнай мясцовасці, урочышча.

Пятр*у*ці – вёска за 51 км на захад ад Паставаў, за 7 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1873 года ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета як вёска Пятруці 1-я (уладальнік Тышкевіч) і Пятруці 2-я (уладальнік Здзяхоўскі). Назва патранімічная, паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *"Пётр"* – "камень, скала" (лац.). Асновай магло быць як беларускае "Пятро", так і літоўскае "Пятрас".

Р

Раб*е*кі – вёска за 17 км на паўночны ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Паловіца. У пачатку XX стагоддзя знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад мянушкі жыхароў: *"рабека"* – гэта чалавек з рабаціннем, з вяснушкамі. У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча *Рабека*.

Рав*ы* – хутар за 13 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на захад ад Лучая. Назва паходзіць ад славянскага слова *"роў"* – "доўгае паглыбленне, выкапанае ў зямлі; канава", якое ўтварылася ад дзеяслова "рыць". Адпаведны геаграфічны тэрмін ёсць і ў літоўскай мове: *ravas* – канава, роў.

Рагa*лі* – вёска за 27 км на захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя вёска ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, флігель Драздоўскага. Назва паходзіць ад асновы *"рог"* – "месца, дзе сыходзяцца, сутыкаюцца два знешнія бакі аднаго прадмета, вугал". У беларускай мове часта сустракаецца выраз *"на рагу"* – " у кутку, у вугле чаго-небудзь". У літоўскай мове тэрмін мае падобнае значэнне: *"ragai"* – "рогі". На

Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Рагалёў, Рагальскі.*

Р_а_**гелі** – хутар за 18 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 4 км на поўдзень ад Камаяў. Назва паходзіць з літоўскай мовы, дзе *"ragelis"* мае значэнні "ражок", "мыс", " выступ". Хутар знаходзіцца на развілцы дарог, *"на рагу"*. На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Рагель.*

Раг_о_**нішкі** – вёска за 38 км на захад ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя вёска ў Лынтупскай гміне Свянцянскага павета, флігель Шастакова. Назва паходзіць ад літоўскай асновы *"ragas"* – "рог", што падкрэсліваецца тыповым балцкім канчаткам "-ішкі".

Раг_о_**ўскія** – вёска за 27 км на паўночны захад ад Паставаў, за 10 км на поўнач ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета як уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад прозвішча *Рагоўскі*, якое і зараз сустракаецца на Пастаўшчыне. У аснове прозвішча – аснова *"рог"* – "цвёрды выраст касцявога рэчыва на галаве". За гэту адметнасць першапачынальнік роду атрымаў у далёкім мінулым мянушку *Рогаў*, якая пазней у нашчадкаў замела форму *Рагоўскі*. Магчыма ўтварэнне прозвішча і ад назвы паселішча. У спісе шляхецкіх прозвішчаў сустракаецца *Рагоўскі з Рогава, Скарбек-Рагоўскі.*

Рад_у_**та** – гл. **Рэд**_у_**та**.

Рак_і_**ты** – вёска за 16 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. Назва адлюстроўвае асаблівасці расліннасці ў мясцовасці, дзе паўстала вёска: *"ракіта"* – "дрэва або вялікі куст сямейства вярбовых". Зараснікі такіх дрэў даволі часта сустракаюцца ўздоўж рэк па нізінах. На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Ракіто*.

Р_а_**лаўцы** – вёска за 15 км на поўдзень ад Паставаў. У 1905 годзе – засценак у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага "*рала"* – "прылада для апрацоўкі зямлі, саха, плуг". Ад гэтай асновы паходзіць і беларускае слова "араць". Верагодна, у час асваення гэтых зямель славянамі лес спальваўся і раскарчоўваўся, а на яго месцы разраблялася зямля. *Ралаўцы*

– аратыя, людзі, якія абраблялі зямлю. У Пастаўскім раёне зафіксавана прозвішча *Ралавец*.

Рам*а*нішкі – вёска за 36 км на захад ад Паставаў, за 3 км на захад ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, маёнтак Даўгялы. Назва патранімічная, паходзіць ад распаўсюджанага імя *Раман*, што ў грэчаскай мове азначае “моцны”. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, якія ўтвораны ад гэтага імя: *Раманенка, Раманенкоў, Раманаў, Рамановіч, Раманоўскі, Раманчук, Раманюк.*

Рам*а*шкавічы – вёска за 17 км на захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўночны захад ад Камаяў. Вядома з 1873 года ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, уладанне Чаховічаў. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *Рамашкавіч*, якое ў сваю чаргу ўтварылася ад імя *Раман*. Яно мае шмат форм, сярод якіх Рамаш, Рамашка, Ромусь, Ромчык і іншыя. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Рамашко*.

Рам*е*йкі – вёска за 27 км на захад ад Паставаў, за з км ад Камаяў. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Адназначна вызначыць паходжанне і сэнс гэтай назвы немагчыма. Найбольш верагодна яе можна вывесці ад літоўскага слова *“ramiai”* – “спакойна, ціха”, адкуль *“рамейка”* – “ціхае і спакойнае дзіця”. Цікавым падаецца і іншы варыянт тлумачэння назвы: *“рамей”* – гэта “візантыец”, жыхар Візантыйскай імперыі. З гісторыі вядома, што полацкія князі хадзілі паходамі на Канстанцінопаль і вярталіся адтуль са здабытым багаццем і вялікім палонам. Не выключана, што рамеяў рассялялі на памежжы Полацкай зямлі і некалькі з іх апынуліся на Пастаўшчыне. У раёне сустракаецца прозвішча *Рамейка*.

Рам*е*лькі – вёска за 3 км на поўдзень ад Паставаў. У пачатку XX стагоддзя знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва патранімічная, утворана ад імя *Раман*, якое на Пастаўшчыне сустракаецца ў форме *Ромель*. У Пастаўскім раёне ёсць і такое прозвішча.

Рачаны – вёска за 40 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. У аснове назвы ляжыць геаграфічны тэрмін *"рака"* – "водны паток значных памераў", ад якога ўтварылася паняццe *"рачына"* – "мясцовасць каля ракі, парэчча". Такім чынам, назва адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць вёскі: яна знаходзіцца каля ракі Пеляка.

Родзі – вёска за 7 км на паўночны захад ад Паставаў. У пачатку XX стагоддзя знаходзілася ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *Родзь*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага імя *Радзівон (Родион)*, што з грэчаскай мовы азначае "герой, гераічны чалавек". Імя ўтварае шматлікія формы, сярод якіх сустракаюцца Родзя, Родзька, Родзік і іншыя. У Пастаўскім раёне ёсць шэраг прозвішчаў, якія ўтварыліся ад гэтага імя: *Радзівонаў, Родзь, Радкевіч.*

Роскаш – вёска за 24 км на паўднёвы захад ад Паставаў на паўднёвым беразе возера В. Швакшты. Назва адлюстроўвае прыродную асаблівасць мясцовасці. У беларускай мове *"роскаш"* – "багацце, пышнасць, разнастайнасць прыроды". Сапраўды, вёска ляжыць у маляўнічай мясцовасці каля прыгожага, самага вялікага на Пастаўшчыне возера Вялікія Швакшты.

Роўнае Поле – вёска за 29 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1640 года, калі ў вёсцы была пабудавана капліца. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва славянская, адлюстроўвае геаграфічную асаблівасць мясцовасці ў ваколіцах вёскі.

Рубеж – вёска за 9 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на ўсход ад Камаяў. Назва славянская, паходзіць ад дзеяслова *"рубіць (секчы)"*. У сярэднявеччы на лініі паміж уладаннямі гаспадароў, якая праходзіла праз лясны масіў, рабілі прасеку, таму тэрмін *"рубеж"* часцей ўжываецца ў значэнні "край, мяжа, граніца". Ёсць меркаванне, што ў старажытнасці каля гэтай вёскі некаторы час праходзіла мяжа паміж пераважна славянскімі і пераважна балцкімі

паселішчамі.

Рудае – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Варапаева. Вядома з пачатку XX стагоддзя ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе было 3 вёскі з назвай Рудая. Мела формы Руда, Рудка. Назва паходзіць ад славянскага *"руды"* у значэнні "рыжа-карычневы, чырванаваты, рыжы". Спачатку назва вызначала асаблівасць мясцовасці, а потым перайшла на вёску. Рыжа-карычневы колер звязаны з афарбоўкай балотнай вады з прычыны таго, што ў ёй знаходзіцца шмат ліманіту – балотнай жалезнай руды. Ад асновы "руды" на Пастаўшчыне ўтворана шмат прозвішчаў людзей: *Руды, Рудаў, Рудык, Рудак, Рудзяк, Рудніцкі, Руднеў, Рудкоўскі, Рудзік.*

Рудзевічы – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў. Вядома з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Рудзевіч*, якое ёсць у спісе беларускай шляхты. Гл таксама *Рудае*.

Рудзі – вёска за 7,5 км на захад ад Паставаў, за 8 км на паўночны ўсход ад Камаяў. Назва паходзіць ад прозвішча *Рудзь*, у аснове якога – мянушка чалавека, які меў адметнасць – быў рудым (рыжым). У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Рудзік, Рудзінскі*.

Рудка – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Варапаева. Вядома з 1782 года як фальварак на 77 двароў. Назва паходзіць ад славянскай асновы *"руды"* – "рыжа-карычневы" і першапачаткова адносілася да рэчкі або да возера, якое мела такі колер вады. Афарбоўка залежыць ад грунтоў, у якіх мелася шмат гліністых часцінак або аржавіння – балотнай руды. Раней каля вёскі знаходзілася цагельня, дзе з мясцовай гліны выраблялі чырвоную цэглу.

Русакі (1) – вёска за 19 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Камаяў. Вядома з 1873 года як вёска ў казённым маёнтку ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе вёска і засценак Сівіцкага. Назва-этнонім адлюстроўвае этнічны склад насельніцтва вёскі. Пераважная большасць жыхароў былі *"русакамі"* – рускімі па нацыянальнасці. Назва сведчыць і пра

тое, што ў вакольных вёсках жыло не рускае насельніцтва – магчыма, балты або ліцьвіны. Бывала, што русакамі называлі і праваслаўных, якія жылі паміж каталікаў-“палякаў”. У Пастаўскім і Мядзельскім раёнах вельмі пашыраным з’яўляецца прозвішча *Русак,* сустракаецца таксама *Русакевіч, Русалоўскі.*

Русакі (2) – вёска за 8 км на поўнач ад Паставаў на правым беразе ракі Мядзелка. Тлумачэнне назвы гл. *Русакі (1).*

Русіны – вёска за 10 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе знаходзілася ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Хлявінскай. Назва адлюстроўвае этнічны склад насельнікаў паселішча. У старажытнасці *"русінам"* звалі любога, хто належаў да славянскіх плямёнаў. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Русінаў, Русецкі*.

Рыбчаны – вёска за 7 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. Назва паходзіць ад славянскага дзеяслова *"рыбачыць"* – “лавіць рыбу”. Назва адлюстроўвае занятак жыхароў. Верагодна, тутэйшыя людзі вызначаліся сваімі рыбацкімі ўменнямі, адкуль і пайшла гэта назва-мянушка. *Рыбчане* – людзі, што займаліся рыбай.

Рылькі – вёска за 16 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе – засценак у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, уладанне Тызенгаўзаў. Назва верагодна паходзіць ад старажытнаславянскага *"рълка"* – “водмель”; *"рель"* – “поплаў”. Слова сустракаецца ў навагародскіх граматах з XII стагоддзя ў блізкіх значэннях “заліўны сенакосны луг”, “невялікае ўзвышша сярод балот”. Вёска знаходзіцца каля вялікай забалочанай поймы прытоку ракі Аржоўка.

Рымкі – вёска за 34 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 19 км на поўнач ад Варапаева. Вядома з 1873 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу; у пачатку XX ст – Пшаздзецкім. Улічваючы тое, што вёска знаходзіцца ў вельмі адметным месцы, якраз у сутоках трох раней суднаходных рэк - Дзісны, Паловіцы і Галбяіцы, можна з вялікай доляй верагоднасці прапанаваць растлумачыць паходжанне назвы ад тэрміна *"рым"* –

“металічнае кола для замацавання тросаў, блокаў, швартовых канцоў, якое ўсталёўваецца ў насавой і кармавой частках караблёў, а таксама на прычалах і набярэжных”. Гэта германскае слова магло быць прынесена ў тутэйшыя мясціны ў раннім сярэднявеччы, калі па рэках праходзіў водны гандлёвы шлях з басейна Заходняй Дзвіны ў басейн Нёмана. Не выключана, што назва паселішчу была дадзена вікінгамі, якія ў даўнія часы часта плавалі па рэках паўночна-заходняй Беларусі і Балтыі. У месцы злучэння трох рэк і быў *"рым"* – “прыстань; месца для прывязвання караблёў да металічных кольцаў”. Можна прапанаваць і прасцейшае тлумачэнне назвы: *Рыма (Рымка, Рымша)* – кананізаванае імя, якое ў лацінскай мове азначае “кінуты”. Можа быць, назва вёскі пайшла ад імя першапасяленца з імем Рыма. У Пастаўскім раёне сустракаецца шэраг прозвішчаў, утвораных ад гэтага імя – *Рымша, Рымко, Рымовіч.*

Рынк*я*ны – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 8 км на поўнач ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага. Тлумачэнне паходжання назвы можна знайсці ў фінскіх мовах, дзе *"rinne"* – “схіл, спуск”, а *"kanta"* – “галава, вяршыня”. Разам атрымліваецца апісанне адметнасці мясцовасці – “вяршыня схілу”. Такое тлумачэнне пацвярджаецца геаграфіяй, бо вёска знаходзіцца на ўзвышшы каля паглыбленай даліны ракі Svіла. Як варыянт, можна прапанаваць тлумачэнне назвы ад германскай асновы *"рынк"* – “кола, кольца”, якое ў сярэднявеччы трансфармавалася ў *"рынак"* – “гандлёвую плошчу”. Звестак пра тое, што ў даўнейшыя часы Рынкяны былі гандлёвым цэнтрам, не знойдзена, але ўскосныя доказы гэтага існуюць. У адрозненне ад суседніх сельскіх населеных пунктаў, якія размешчаны ўздоўж дарог, Рынкяны вызначаюцца тым, што сюды сходзіцца пяць шляхоў. У Пастаўскім раёне пражываюць людзі з прозвішчам *Рынкевіч*.

Р*э*дзькаўшчына – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў каля Варапаева. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *Радзька (Рэдзька)*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага імя *Радзівон (Родион)*, што з грэчаскай мовы

азначае "герой, гераічны чалавек". Імя ўтварае шматлікія формы, сярод якіх сустракаюцца Радзька, Радко, Радзько, Родзька і іншыя. Фармант "-шчына" паказвае, што тутэйшая мясцовасць належала гаспадару з імем Рэдзька. У Пастаўскім раёне пражываюць людзі, прозвішчы якіх утвораныя ад гэтай формы імя Радзівон: *Радзько, Радкевіч, Радзьковіч* (дарэчы, у в. Ляхаўшчына, што ляжыць недалёка ад Рэдзькаўшчыны)

Рэд*у*та – вёска за 28 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1790 года як вёска з 13 дымоў. У 1873 годзе вёска ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, уладанне Канткоўскай. Найпрасцей растлумачыць назву з французскай мовы, дзе *"redoute"* – гэта "палявое земляное ўмацаванне, акружанае валам і ровам", і звязаць яе ўтварэнне з падзеямі вайны 1812 года, калі французскія войскі праходзілі праз гэту мясцовасць ў час паходу на Расію. Існуе легенда, што такую назву вёсцы даў мясцовы памешчык, які сам быў удзельнікам тых гістарычных падзей. Але, верагодна, назва ўтварылася значна раней ад асновы, блізкай да слоў *"род, рада, радавод, радня"*, тым больш што ў вымаўленні яна часцей гучыць як "Радута". Пра старажытнасць і сакральнасць назвы сведчаць даўнія раннехрысціянскія могілкі і магчымае існаванне капішча. У пачатку XXI стагоддзя на гэтым месцы рупнасцю мастака Алеся Цыркунова ўсталявана каплічная брама.

Р*э*пішкі (Р*э*пешкі) – хутар за 28 км на захад ад Паставаў, за 5,5 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва паселішча паходзіць ад назвы расліны "рэпік" (рус. "репей") – "род шматгадовых травяністых раслін сямейства складанакветных, якія маюць звычайна калючкі". Найбольш вядомым прадстаўніком роду з'яўляецца лопух. Урочышчы з такімі раслінамі заўважаліся мясцовымі жыхарамі і часта ўводзіліся ў тапанімію. У Беларусі шырока распаўсюджаны назвы "рэпішча", "рэпнікі". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Рэпін, Рэпнікаў.*

С

Саб*о*лкі – вёска за 36 км на захад ад Паставаў, за 3,5 км на паўночны захад ад Лынтупаў на правым беразе ракі

Пеляка. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, уваходзіла ў маёнтак Раманішкі Ксаверыя Даўгялы. Назва паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"са" (шо, соо, суо)* мае значэнне "балота", а *"бола"* – "паселішча". Разам атрымліваецца "паселішча на балоце", што адпавядае геаграфічнай характарыстыцы мясцовасці. Падобнае значэнне слова сустракаем і ў ненецкай мове, дзе *"сабол"* – "балота, дрыгва".

С*а*вічы – вёска за 9 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў на правім беразе ракі Лучайка. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Савіч*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага імя *Савва*. Разам з вельмі пашыраным на тэрыторыі Пастаўскага раёна прозвішчам *Савіч* сустракаюцца таксама *Савіцкі, Савінскі, Савел, Савосін, Саўчанка, Саўчук.*

Сакал*ы* – вёска за 16 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лучая. Назва паходзіць ад прозвішча *Сокал*, якое ўтворана ад мянушкі. Так называлі смелага і прыгожага юнака, мужчыну, параўноўваючы яго з птушкай "сокал". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Сокал, Сакалоўскі, Саколка, Сакалоў, Сакольскі.*

Сак*у*ны – вёска за 18 км на захад ад Паставаў, за 1,5 км на ўсход ад возера Янкішкі. Назва паходзіць ад наймення беларусаў-сакунаў, арэал пражывання якіх першапачаткова знаходзіўся на Палессі ў басейнах рэк Пціч і Арэса. Асаблівасцю іх была цвёрдае вымаўленне "–са" (заместа "–ся") у зваротных дзеясловах (зваліўса, пабіўся, ганарыўса і г. д.). Верагодна, тутэйшыя жыхары вёскі таксама вызначаліся такой адметнасцю.

Магчыма звязаць паходжанне назвы са скіфскім народам *сакі – групай плямёнаў-качэўнікаў*, якія жылі ў VIII-IX стагоддзях у Заволжжы і якія прасоўваліся з іншымі народамі на захад.

Салаў*і* – вёска за 7 км на паўднёвы захад ад Паставаў. Назва паходзіць ад прозвішча *Салавей*, якое ўтворана ад

адпаведнай мянушкі. Так называлі чалавека, які меў прыгожы, чысты, пераважна высокі голас. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Салавей, Салаўёў, Саловаў.*

Салаў*і*ха – вёска за 21 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 4 км на захад ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак Пяткевіча, Шырневіча і Яцыны. Тлумачэнне назвы гл. *Салаўі.*

Саранч*а*ны – вёска за 25 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 10 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў на ўсходнім беразе возера Саранчаны. У 1861 годзе была ў Свянцянскім павеце Віленскай губерні, маёнтак Канткоўскага. У пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад наймення возера і мае фіна-ўгорскі радавод: *"sara"* (фін., карэл.) – "балота, вялікае балота, мора, забалочаная рэчка". Другая частка слова – *"чаны"* мае, напэўна, значэнне "возера". Такім чынам, сэнс назвы можа гучаць як "забалочанае возера". Сапраўды, возера мае невялікую глыбіню (макс. 3,5 м) і моцна зарастае.

Сарап*о*ны – вёска за 15 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы захад ад Лучая. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад імя *Сарапон*.

Сар*о*кі – вёска за 32 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на ўсход ад Варапаева паміж возерам Сарокі і ракой Ласіца. Назва паходзіць ад прозвішча *Сарока*, якое, верагодна, утварылася ад мянушкі. Напэўна чалавек, якога ёй "узнагародзілі", любіў пагаварыць, "сакатаў, як сарока". У Пастаўскім раёне шырока распаўсюджаны прозвішчы *Сарока, Сарокін.* Магчымае і паходжанне назвы з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"sara"* – "балота, забалочаная рэчка" (карэл., фін.). Побач з вёскай знаходзіцца невялікае возера і рэчка.

Сар*о*чына – вёска за 9 км на поўдзень ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе меліся вёскі Сарочына 1-е і 2-е, старожка, засценак князя Друцкага-Любецкага, маёнтак. Назва паходзіць з фіна-

ўгорскіх моў, дзе *"sara"* – "балота, забалочаная рэчка" (карэл., фін.). Побач з вёскай знаходзіцца возера Сарочынскае.

Сасн*о*ўшчына – вёска за 35 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 17 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. Назва адлюстроўвае прыродную асаблівасць урочышча, дзе знаходзіцца паселішча: *"мясцовасць, дзе растуць сосны"*. Гэту адметнасць падкрэслівае прасторавы фармант "-шчына".

Свербляўшч*ы*зна – вёска за 23 км на захад ад Паставаў, за 10 км на ўсход ад Лынтупаў на правым беразе ракі Яновіца. Паходжанне назвы можна звязаць з літоўскім словам *"zvirblis"* – "верабей".

Св*і*дна – вёска за 28 км на ўсход ад Паставаў, за 7,5 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева каля возера Свідна. Вядома ў 1781 годзе як сяло Свірбна ў маёнтку Дунілавічы Ашмянскага павета. У пачатку XX стагоддзя ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак Свідна, уладанне графа Тышкевіча. У 1930 годзе меўся цагельны завод, які належаў Тадэвушу Шкорніку. Назва вёскі ўтварылася ад наймення возера, якое мае фіна-ўгорскія карані: *"syva"* – "глыбокі" і *"to"* – "возера".

Svіл*е*лі – вёска за 10 км на паўночны захад ад Паставаў. У пачатку XX стагоддзя ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Свілель*, якое ўтварылася ад імя або мянушкі *Svіла*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Svіла, Svілель, Svілёнак.*

Славянскае дыялектнае *свіль* або *цвіль* азначае зарастаючае возера.

Свін*і*ца – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Варапева. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва, верагодна, адлюстроўвае адметную асаблівасць тутэйшай мясцовасці – раней тут вадзілася многа дзікіх кабаноў. Дарэчы, і зараз у суседнім лясным масіве Варапаеўская Дача іх таксама шмат.

Больш праўдападобнай можа выглядаць версія паходжання назвы ад дыялектнага слова *"свіннік"*, што

азначае зараснік цвёрдага *сіўцу* - шматгадовай травяністай расліны сямейства злакаў з цвёрдым шчацінападобным сцяблом, якая сустракаецца на дрэннай пашы, лузе.

Свір*а*ны – вёска за 16 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на поўдзень ад Камаяў. Назва славянская, паходзіць ад наймення пабудовы: *"свіран"* – "халодны будынак, прызначаны для захоўвання збожжа, мукі і іншых прадуктаў, а таксама рэчаў і падобнага". Верагодна, Свіраны выраслі на месцы гаспадарчых пабудоў маёнтка Каралінова, які належаў Сулістроўскім, а пазней – Ромэрам.

Свірд*у*ні (Свірд*у*ны) – вёска за 30 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3,5 км на ўсход ад Лынтупаў каля вытокаў ракі Олксна. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, маёнтак Канткоўскага. Назва паходзіць з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"syva"* – "глыбокі", а *"duna"* – "рака" (Зах. Дзвіна раней называлася Дуна). Зараз праз вёску цячэ невялікая рачулка Олксна і быццам бы няма ніякіх доказаў таго, што яна калісьці была глыбокай. Аднак геаграфічны аналіз паказвае, што ў даўнія часы рака ў гэтым месцы сапраўды мела значную глыбіню, бо ніжэй па цячэнні каля вёскі Вінцэнтава знаходзіцца прыродная ледавіковая града, якую водны паток марудна, але настойліва перапілоўваў. Урэшце на месцы глыбокага і даволі шырокага ўчастка Олксны засталося толькі балота, у цэнтральнай частцы якога яшчэ трывае невялікае азярцо.

Св*і*ркі – вёска ў Камайскім сельсавеце. Назва паходзіць ад прозвішча і імя *Свірка (Свірко)* – формы імя *Свірыд*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага і каталіцкага *Спірыдон* (кошык). У Пастаўскім раёне ўтворана шмат прозвішчаў ад гэтага імя: *Свірко, Свірыдзенкаў, Свірыдаў, Свірыдовіч, Свірковіч, Спірыдовіч, Спірыдонаў, Спірадовіч.*

Св*і*рплішкі – вёска за 31 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, флігель Бішэўскага. Назва, верагодна, мае фіна-балцкае паходжанне. Першапачатковай асновай стаў тэрмін *"syva"* – "глыбокі". Магчыма, ён быў перанесены з суседняй вёскі Свірдуні. Пазней

да яго далучылася балцкае *"plesines"* – "высечанае месца ў лесе, разараная ніва". Такім чынам, вёска ўзнікла на "глыбокай плешыне сярод лесу". Цікава, што сучаснае месцазнаходжанне паселішча пацвярджае тлумачэнне назвы: яно ляжыць на невялікім лапіку "голай" зямлі сярод спрадвечнага і даволі вялікага ляснога масіву.

С*е*нькішкі – вёска за 31 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы усход ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў складзе Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, уладанне Бішэўскага. Назва паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя *Сямён (Сімеон)*, якое ўтварае шмат форм, у тым ліку *Сеня, Сенька, Сенік*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Сянько, Сенькавец, Сенюковіч.*

С*е*ргі – вёска за 30 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 16 км на поўдзень ад Варапаева. У пачатку XX стагоддзя была ў складзе Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя *Сергій*, што азначае "высокі", "шаноўны". Яно ўтварае шмат форм, у тым ліку і *Серга, Сярго, Сяргуля, Сяргуша*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад імя Сяргей: *Сяргееў, Сяргеенкаў, Сяргейчык, Сяргіенкаў.*

С*і*маны – вёска за 15 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўднёвы захад ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад яўрэйскага імя *Сімон (Сымон, Шымон),* што азначае "паслухмяны". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Сіманёнак, Сімановіч, Сымановіч, Сіманька, Сіманайць, Сіманчук.*

С*і*манькі – вёска ў Шыркаўскім сельсавеце. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Сіманька*, якое ўтварылася ад яўрэйскага імя *Сімон (Сымон, Шымон)*, што азначае "паслухмяны". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Сіманёнак, Сімановіч, Сымановіч, Сіманька, Сіманайць, Сіманчук.*

С*ў*цы – вёска за 5 км на поўнач ад Паставаў на

паўночным беразе возера Белае. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Віленскай губерні. У аснове назвы ляжыць каляровая адметнасць: *"сівы"* – "чалавек з белымі валасамі або з валасамі, якія страцілі сваю афарбоўку". Верагодна, гэтай асаблівасцю вызначаліся жыхары гэтай вёскі.

Паводле іншай версіі, назва паходзіць з беларускай мовы, дзе "сівіца" або "сівец" азначае вільготнае месца з зараснікам *сіўца* – шматгадовай травяністай расліны сямейства злакаў з цвёрдым шчацінападобным сцяблом, якая сустракаецца на дрэннай пашы, лузе.

У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Сіваш, Сівіцкі, Сіўко, Сіўчак.*

Ск*а*рпаўцы – вёска за 23 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы захад ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага тэрміна *"скарпа"*, які мае значэнне "стромкая вяршыня гары", "круты схіл". Геаграфія пацвярджае такое тлумачэнне, бо, сапраўды, у ваколіцах вёскі рэльеф вельмі складаны, узгорысты, са стромкімі схіламі.

Скварц*о*ва – вёска за 16 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на наўднёвы захад ад Варапаева каля вёскі Лучай. Назва ўтворана ад прозвішча першапасяленца *Скварцова*. Пасля бунту мясцовых жыхароў, які адбыўся ў Лучаі ў 1905 годзе і у час якога была разбурана пратэстанцкая кірха, уладальнік тутэйшых зямель барон Клейгельс перасяліў сюды сялян з Расіі. Верагодна тады і патрапілі на Пастаўшчыну Скварцовы. Прозвішча гэта сустракаецца і зараз.

Скр*у*нды – вёска за 26 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў на заходнім беразе возера Саранчаны. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Верагодна, назва ўтворана ад асновы *"кру-"*, якая сустракаецца ў славянскіх і балцкіх мовах у значэнні *"круча, круты"*; у літоўскай мове – *"krucis"*. Геаграфічна вёска знаходзіцца ў даліне ручая, абапал якога падымаюцца крутыя схілы. Нельга выключаць і паходжанне назвы ад балцкага

прозвішча *Скрунда*, што ад *"skrundele"* – "мурашка".

Скур*а***ты** – вёска за 12 км на поўдзень ад Паставаў, за 2 км на поўнач ад Вярэнек. Назва адлюстроўвае занятак жыхароў. Яны абраблялі *скуры* жывёл, адкуль і пайшла мянушка-прозвішча. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Скурат, Скурка, Скур'ят, Скурацёнак.*

Слабад*а* – вёска за 13 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на поўнач ад Навасёлак. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак барона Клейгельса. Назва вёскі адлюстроўвае асаблівасці даўнейшых эканамічных адносін: *слабада* – гэта паселішча, жыхары якога на пэўны тэрмін вызваляліся ад падаткаў.

Сліж*о***ва** – вёска за 13 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2 км на захад ад Груздава. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, належала Хомскім і Козелам. У 1905 годзе – вёска і засценак Палякевіча. Паходжанне назвы можна звязаць з дыялектным словам *"слезня"* – "крыніца на балоцістым лузе". Пастаянны выхад вады на паверхню робіць глебы вільготнымі, слізкімі, што, магчыма, і дало штуршок для ўтварэння гэтай назвы. Паходжанне назвы вёскі можна звязаць і з прозвішчам *Сліж*, якое ўтварылася ад наймення невялікай рыбы "галец".

Смычч*о* – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад Груздава абапал ракі Аржоўка. У 1905 годзе фальварак Пшаздзецкіх Смыч знаходзіўся ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Таксама былі аднайменныя старожка і выселак. Назва паходзіць ад старажытнага славянскага дзеяслова *"смыкацца"* – "рабіць сутарговыя рухі". Гэта слова, напэўна, характарызуе адметнасць ракі Аржоўка, якая мела непастаянную плынь, звілістае рэчышча. Цікава, што недалёка ад вёскі, на ўсходняй ускраіне Груздаўскай лясной дачы, цячэ рака Смычыца, назва якой пацвярджае найменне паселішча.

С*о***ўкі** – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Соўка*, якое

ўтварылася ад імя або мянушкі. Найбольш верагодным падаецца яго ўтварэнне ад дыялектнага дзеяслова *"соўкаць"* – "песціць, апекавацца, нянькацца". Адсюль і *"соўка"* – "пястун, распешчаны". Магчымы варыянт паходжання назвы ад імёнаў *Сава і Вячаслаў*, якія сустракаюцца ў формах Саўка, Саўко. Сустракаецца і версія паходжання ад назвы птушкі *"соўка"*, якая адносіцца да сямейства сапраўдных соў. У Пастаўскім раёне распаўсюджаны прозвішчы *Соўка, Саўкоў*.

Сп*о*ры Вял*і*кія – вёска за 10 км ад Паставаў. Вядома з 1557 года як маёнтак Фурсаў. Назва паходзіць ад возера *Споры*. Падобнае найменне мае і рэчка Спарыца, якая злучае азёры, і з воз. Споры цячэ ў воз.Задзеўскае. Калі палічыць, што засяленне гэтай мясцовасці ішло па рацэ, то і назва ракі павінна быць першаасновай. Прыдатнае тлумачэнне даюць славянскія мовы. *"Спорная вада"* – гэта месца, дзе сходзяцца дзве плыні, "сшибка встречных потоков" (Даль). Сапраўды, недалёка ад воз.Задзеўскага ў Спорыцу ўпадала рака Глодаўка. На месцы сутокаў існавала невялікае возера, якое зараз ператварылася ў балота. У гэтым возеры і маглі актыўна праяўляцца буруны, вадавароты, інакш кажучы, спорная вада. Нельга выключыць і паходжанне назвы з фіна-ўгорскіх моў, дзе *"сора"* мае сэнсавыя значэнні "рэчышча ракі", "сутокі рэк", "невялікая рэчка".

Стан*е*левічы (Станіл*е*вічы)– вёска за 34 км на ўсход ад Паствавау, за 12 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Норыцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Станелевіч*, якое пайшло ад імя *Станіль*, утворанага ад старажытнаславянскага, кананізаванага каталіцкай царквой, імя *Станіслаў* – "стане слаўным".

Ст*а*нчыкі – вёска за 29 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 12 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў каля возера Балдук. У 1920 годзе у Лынтупскай гміне Свянцянскага павета Віленскага ваяводства. Назва паходзіць ад імя *Станчык*, якое ўтварылася ад імя *Станіслаў*. У Пастаўскім раёне пражываюць *Станчыкі, Станюшы, Станіслававы.*

Старч*у*ны – вёска за 17 км на захад ад Паставаў каля

Гадуцішак. Назва паходзіць, верагодна, ад прыслоўя *"старчма, старчаком"* у значэнні "стаўмя, вертыкальна". Такое тлумачэнне мае абгрунтаванне на мясцовасці. Побач з вёскай у глыбокай даліне цячэ рака Камайка, у якой абрывістыя берагі маюць вышыню 3-6 метраў.

Стар*ы* Двор – вёска за 16 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на захад ад Варапаева каля возера Старадворскае. У 1885 годзе – маёнтак у Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні; меўся вінакурны завод. Назва адлюстроўвае гістарычную адметнасць паселішча: тут знаходзіўся *"двор"* – рэзідэнцыя ўладальнікаў гэтай мясцовасці. Верагодна, раней вёска называлася проста Двор, а пасля таго як частка былых яе жыхароў заснавала новае паселішча, Навасёлкі, то Двор стаў Старым.

Стах*о*ўскія – вёска за 35 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 17 км на поўнач ад Варапаева на левым беразе ракі Галбяіца. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Стахоўскі*, якое ўтворана ад імя апостала *Стахія*, што азначае "колас". На Пастаўшчыне сустракаецца прозвішча *Стахоўскі*.

Ст*о*нішкі – вёска за 28 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад літоўскага *"stonijos"* – "пастаўнік, загарода для жывёлы ў полі". Зараз недалёка ад вёскі знаходзіцца малочна-таварная ферма.

Ст*у*каўшчызна – вёска за 33 км на захад ад Паставаў, за 4,5 км на поўнач ад Лынтупаў. Назва, верагодна, паходзіць ад фінскага тэрміна *"suo"* – "балота", якое ў славянскіх мовах трансфармавалася да формы "стук". Доказам гэтага з'яўляецца і назва балота Стукач каля Вілейкі. З гэтага вынікае, што найменне вёскі ўтварылася ад урочышча, якое знаходзіцца ў забалочанай мясцовасці, што сапраўды так і ёсць. Існуе версія, што назва магла ўтварыцца ад слова *"истукан"* – "ідал, стод", і магла адносіцца да мясцовасці, дзе месцілася паганскае капішча.

С*у*бачы – вёска за 25 км на паўднёвы захад ад

Паставаў, за 9 км на ўсход ад Лынтупаў. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе былі вёскі Субачы Дальнія і Субачы Бліжнія. Назва, верагодна, паходзіць ад старaславянскага геаграфічнага тэрміна *"субач"* у значэнні "водападзел", "узвышша паміж паніжэннямі". У Еўрапейскай частцы Расіі сустракаюцца словы "бачаг", "бачага", "буча", якія тлумачацца як "балота з ручаём", "забалочаная нізіна". У Беларусі сустракаюцца назвы Бачканы, Бачылаўка. Фармант "су-" характарызуе злучэнне аб'ектаў, іх блізкасць. Такім чынам, *"субач"* – гэта месца, дзе сыходзяцца дзве нізіны, два балоты. Пастаўскія Субачы пацвярджаюць гэта. Вёска знаходзіцца на водападзеле, на ўзгорку, з якога расцякаюцца ручаі на поўнач і на поўдзень. Ад назвы вёскі ўтварылася прозвішча, якое пашырана на Пастаўшчыне і Мядзельшчыне.

Сурв*і*лішкі – вёска за 19 км на захад ад Паставаў, за 7 км на паўночны захад ад Камаяў паміж азёрамі Вялікія і Малыя Сурвілішкі. У 1905 годзе маёнтак Чаховічаў у Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва вёскі ўтварылася ад наймення азёр Сурвілішкі, якія знаходзяцца ў басейне р. Камайка (цячэ праз азёры) і мае фіна-ўгорскія карані, хоць канчатак ў ёй тыпова балцкі. Але ён быў дададзены пазней, а першапачаткова возера называлася *"Саравіл"*, дзе *"sara"* (фін., карэл.) – "балота","забалочаная рака", а *"vil"* (чуваш.) – "рэчышча ракі", "старыца", "возера ў пойме ракі". Геаграфічны аналіз пацвярджае верагоднасць такога тлумачэння: азёры па сутнасці уяўляюць сабой забалочаныя расшырэнні р. Камайка. Такім чынам, першапачатковы сэнс назвы возера фармуляваўся як "забалочанае возера ў пойме ракі".

Сух*а*рышкі – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 9 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У пачатку ХХ стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе вёска і засценак, які належаў Зубаву. Назва ўтварылася ад славянскага прыслоўя *"суха"* ў значэнні "сухое месца". Вёска сапраўды знаходзіцца на даволі высокім узгорку ў акружэнні паніжаных далін, па якіх цякуць ручаі.

Паводле легенды, у вельмі даўнія часы, калі Гасподзь хадзіў па зямлі, у тутэйшай мясцовасці быў вялікі няўрод, людзі галадавалі. Сядзеў тады на прызбе хаты бядняк, грыз апошні сухар. Як раз праз вёску праходзіў Бог у вобразе простага чалавека. Бядняк пашкадаваў падарожнага вандроўніка, разламаў сухар і падзяліўся сціплай ежай з ім. Вось таму вёска і завецца Сухарышкі.

Сярг*е*евічы – вёска за 26 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў складзе Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні каля сплаўной ракі Заражанка. Назва паходзіць ад прозвішча *Сяргеевіч*, якое ўтворана ад кананічнага праваслаўнага імя *Сергій*, што азначае "высокі", "шаноўны". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад імя Сяргей: *Сяргееў, Сяргеенкаў, Сяргейчык, Сяргіенкаў.*

Т

Тар*а*саўка – вёска за 9 км на паўночны ўсход ад Паставаў. У 1905 годзе вёска і хутар ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Пшаздзецкіх. Назва паходзіць ад імя *Тарас*, якое ўтворана ад кананічнага праваслаўнага імя *Тарасій*, што значыць, "усхваляваны, бунтоўны, трывожны". У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Таразевіч, Тарасевіч, Тараскевіч, Тарасаў, Тарашкевіч.*

Траб*у*цішкі – вёска за 33 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, належала Бішэўскаму. Назва паходзіць ад літоўскага *"trabas"* – "хата», або ад прозвішча Trabutis.

Тр*а*пшавічы – вёска за 19 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 4 км на захад ад Камаяў. Назва паходзіць ад літоўскага *"trabas"* – "хата", або ад прозвішча Trabutis.

Тр*у*мпічы – вёска за 28 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 11 км на поўнач ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва, верагодна, паходзіць ад аглушанай славянскай асновы *"друм, дром"*, што азначае "лясны

гушчар", "густы зараснік", "непраходнае балота". Вёска сапраўды знаходзіцца каля забалочанага вялікага ляснога масіву "Варапаеўская дача". Магчыма паходжанне з балцкіх моў, дзе літоўскае trumpas азначае «кароткі».

Труханк*і* – вёска за 15 км на поўдзень ад Паставаў. Назва паходзіць ад прозвішча *Трухан*, якое ўтварылася ад грэчаскага імя *Трахім (Трафім)*, што значыць "выхаванец". У Пастаўскім раёне ад гэтага імя ўтварыліся прозвішчы *Трафімаў, Трахімовіч, Трошка, Атрахімовіч.*

Т*у***збіца** – вёска за 27 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 1 км на паўднёвы захад ад возера Белькі У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва вёскі паходзіць з фіна-ўгорскіх моў: *"ту", "то"* (комі, удм.) – "возера", *"ба"*(самад.) – "рака". Такім чынам, Тус-ба – "возера, з якога выцякае рака; праточнае возера". Геаграфічна такое пацвярджаецца: з возера выцякае ручай у р. Паловіца. У Пастаўскім раёне ёсць і возера Тусьба.

Тумулёўшчына – вёска за 11 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6,5 км на ўсход ад Камаяў. Карані назва можна знайсці ў лацінскай мове, дзе *"tumuli"* – "курганы, груды". У Балгарыі *"тумулі"* – магільныя курганы фракійцаў. Вядомы і дацкія *"тумулі"* – курганы.

Т*у***рлы** – вёска за 9 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелка. Назва паходзіць ад прозвішча *Турла*, якое, верагодна, утварылася ад старажытнага імя *Тур*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Турла, Туркоў, Турлакоў, Турон, Туронак.*

Ф

Фав*о***ры** – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 7,5 км на ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Адназначна растлумачыць паходжанне назвы пакуль што немагчыма. Можна прапанаваць некалькі версій. Першая: назва паходзіць ад *"фавор"* (лац. Favor) – "прыхільныя адносіны знатнай асобы да каго-небудзь". Другая: ад славянскага *"фаворкі"*(польскае "faworki" – "хворост") – "сухія

галінкі з дрэў або хмызняку”. Трэцяя: ад татарскага імя *Фаварыс*, што азначае *"рыцар, мужны чалавек, спрытны вершнік"*.

Ф*а*левічы – вёска за 11 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3 км на поўнач ад Вярэнек. Назва паходзіць ад прозвішча *Фалевіч,* якое ўтворана ад *Фаль* – формы кананічнага імя *Фалалей,* што значыць “квітнеючая масліна”. На Пастаўшчыне раней існавала вёска Фалькава. Зараз у Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Фалевіч*.

Філіп*о*ўцы (Пиліпоўцы)– вёска за 13 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў каля вытокаў ракі Караліноўка. У 1873 годзе была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад кананізаванага праваслаўнага і каталіцкага імя *Філіп (Піліп)*, што значыць “аматар коней”. У Пастаўскім раёне ад гэтага імя ўтварыліся прозвішчы *Філіпенкаў, Філіповіч, Філіпаў, Філь, Піліпенка, Піліпёнак, Піліпчук.*

Фр*а*напаль (Франап*о*ль) – хутар за 11 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на поўдзень ад Навасёлак. Назва складаецца з двух частак. Першая “франа” утварылася ад імя *Франак* – польскага каталіцкага *Franciszek.* Другая частка мае значэнне *"поле"* – “ралля, апрацаваная зямля”. З гэтага вынікае, што назва паселішча першапачаткова адносілася да мясцовасці “Франкава поле”.

Фярк*і* – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 3 км на захад ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, належала Соф’і Мастоўскай. Назва паходзіць ад імя *Фярко*, якое ўтворана ад кананічнага *Ферапонт*, што значыць “слуга”. У Пастаўскім раёне зафіксавана прозвішча *Фярковіч.*

Х

Х*а*ркі – вёска за 25 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўночны ўсход ад Варапаева на правым беразе ракі Заражанка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад імя *Харко*, якое ўтварылася ад праваслаўнага кананічнага імя *Харытон*, што значыць

“дабрадзейны, шчодры”. У Пастаўскім раёне ад гэтага імя пайшлі прозвішчы *Харытонаў, Харытоненка, Харко, Харько, Харкоў.*

Хац*і***лы** – вёска за 3 км на паўночны захад ад Паставаў абапал ракі Мядзелка. У пачатку XX стагоддзя была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад славянскага *"хата"* – жылая сялянская пабудова, зрубленая з бярвення”. Ад асновы “хат-“ утварылася прозвішча *Хаткевіч*, якое пашырана на Пастаўшчыне.

Храл*ы* – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на паўднёвы захад ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, належала Соф’і Мастоўскай. У 1905 годзе – вёска і засценак. Назва паходзіць ад прозвішча або імя *Хрол*, якое з’яўляецца беларускай формай кананічнага праваслаўнага імя *Фрол*, што значыць “квітнеючы”. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Хрол.*

Хрыст*о***ва** – вёска за 38 км на ўсход ад Паставаў, за 13 км на ўсход ад Дунілавічаў. У 1861 годзе казённы маёнтак Хрыстова. У 1873 годзе вёска ў Норыцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе – фальварак і вёска. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Хрыста*, якое ўтворана ад кананічнага *Хрыстафор*, што значыць “хрыстаносны; той, хто нясе па жыцці крыж веры, святасці, духоўнасці”.

У лесе побач з Хрыстовам ёсць урочышча Горкі. Існуе легенда, што ў XI стагоддзі там быў узведзены манастыр. Першыя манахі-хрысціяне, пахрысціўшы 14 мясцовых людзей, называлі іх дзецьмі Хрыста. А месца — Хрыстовым. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Хрысталовіч*.

Мясцовыя жыхары расказваюць і такую версію: паселішча гэта было заснавана жыхарамі вёскі Цівунцы Зыгмундам і Юзюком Зямчонкамі. Яны купілі 14 валок зямлі і назвалі мясцовасць “Хрыстова”.

Ц

Цалін*о* – вёска за 9 км на паўночны захад ад Паставаў, за 2,5 км на паўночны ўсход ад Ярэва. У 1873 годзе вёска Цылін у Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад славянскага тэрміна *"цаліна"* –

“некранутая, ніколі не араная, але прыдатная для апрацоўкі зямля”.

Цалінова – вёска за 13 км на захад ад Паставаў, за 4,5 км на поўнач ад Камаяў. Назва паходзіць ад славянскага тэрміна *"цаліна"* – “некранутая, ніколі не араная, але прыдатная для апрацоўкі зямля”.

Целякі – вёска за 9 км на поўнач ад Паставаў на правым беразе ракі Мядзелка. Назва паходзіць ад прозвішча Цяляк, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі: *"цяляк"*, тое самае, што і *"целяпень"* – “непаваротлівы, марудлівы чалавек”. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Цяляк (вельмі шырока), Цялятнікаў, Целіч, Целеш.*

Цёплыя – вёска за 12 км на паўночны ўсход ад Паставаў на рацэ Паловіца. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Цёплы*, якое распаўсюджана на Пастаўшчыне. *"Цёплы"* – гэта чалавек, які вызначаецца душэўнай цеплынёй; ласкавы, добразычлівы”.

Цешылава – вёска за 12 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 6 км на захад ад Лучая. Назва, верагодна, паходзіць ад беларускага дзеяслова *"цешыцца"* – “радавацца, мець асалоду”. Вёска сапраўды знаходзіцца ў маляўнічай мясцовасці, якая “цешыць вока”.

Цівунцы – вёска за 19 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на захад ад Варапаева. Назва ўтварылася ад пасады або мянушкі чалавека. *"Цівун"* – наглядчык за працай сялян у памешчыка ў часы прыгону. З гэтым звязана і паходжанне прозвішча *Цыўнель*, якое пашырана на Пастаўшчыне.

Цырклішкі Вялікія – вёска за 30 км на захад ад Паставаў, за 8 км на поўнач ад Лынтупаў. Назва паходзіць ад літоўскага “cirkslys” – “плакса, крыкун”.

Цябуты – вёска за 14 км на захад ад Паставаў, за 7 км на поўнач ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе – засценак. Назва паходзіць ад прозвішча Цябут, якое, верагодна, утварылася ад адпаведнай мянушкі, якая пайшла ад стажытнаславянскага дзеяслова *"сцябушыць"* –

"сцягнуць, украсці". Адсюль цябут – гэта той, хто крадзе (Ф).

Цял*я*тнікі – вёска за 12 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на захад ад Камаяў. Назва паходзіць ад славянскага *"цялятнік"* – "хлеў для цялят". Гэта невялікае паселішча ўзнікла на месцы, дзе знаходзіліся пабудовы для жывёлы. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Цялятнікаў*.

Ч

Чаранк*і* – вёска за 5 км на ўсход ад Паставаў на левым беразе ракі Лучайка. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Адназначна растлумачыць паходжанне назвы пакуль немагчыма. Можна прапанаваць некалькі варыянтаў, кожны з якіх мае абгрунтаванне. Назва вёскі магла ўтварыцца ад беларускага даўняга слова *"чарэнь"* – "ляжанка на печы". Вельмі верагодна, што першыя жыхары мелі мянушку *"чарэнкі"* – "аматары паляжаць на печы". У доўгія зімовыя вечары раней вясковыя людзі так у асноўным і бавілі час. Другі варыянт – паходжанне ад слова *"чаранок"* – "частка сцябла расліны", "атожылак", "парастак", што магло выкарыстоўвацца для абагуленай назвы нашчадкаў. Паходжанне назвы можна звязаць і з народным геаграфічным тэрмінам *"чарэнь"* – "тарфяное балота", якое сапраўды знаходзіцца недалёка ад вёскі. А ў польскай мове ёсць слова *"czarny"* – "чорны". У Пастаўскім раёне шырока распаўсюджана прозвішча *Чарэнка*, а таксама сустракаюцца *Чарненка, Чэрнік, Чарноў, Чарных, Чарнюк, Чарняўскі.*

Чарт*ы* – вёска за 8 км на паўночны ўсход ад Паставаў на паўночным беразе возера Чарты. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе – вёска і хутар Чарты, ці Засінак (уладанне Пшаздзецкіх). Назва вёскі паходзіць ад наймення возера, а яно мае фіна-ўгорскія карані: *"чэр"* (комі) – "прыток ракі, рака", *"ты"* (комі, удм.) – "возера". Сэнс назвы можна растлумачыць як "возера, якое злучаецца ракой з другім возерам". На мясцовасці воз.Чарты злучаецца рачулкай з воз.Тусьба.

Чар*э*мушнікі Пагарн*ь*я – вёска за 18 км на паўночны

ўсход ад Паставаў на левым беразе ракі Паловіца. У 1905 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. (Тлумачэнне гл. *Чарэмушнікі Падзісенныя*)

Чар*э*мушнікі Падзіс*е*нныя – вёска за 20 км на паўночны ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Дзісна. У 1905 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Паходжанне назвы вёскі можна звязаць з назвай расліны *"чарэмшына" ("чаромха")* – "дрэва ці высокі куст сямейства ружакветных з сабранымі ў гронкі белымі духмянымі кветкамі і чорнымі даўкімі на смак ягадамі". Магчыма, гэтыя мясціны вызначаліся чаромхавымі зараснікамі над рэкамі. Як варыянт, паходжанне назвы вёсак можна звязаць з даўнім славянскім словам *"чарэмны"* – "прыгожы". У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча Чарамных. Другая частка ў назвах адлюстроўвае геаграфічнае становішча паселішчаў: *Падзісенныя* – каля Дзісны, *Пагарныя* – па ўзгорках.

Чашк*о*ўшчына – вёска за 15 км на ўсход ад Паставаў, за 9 км на захад ад Варапаева. Назва паходзіць ад славянскага *"чашча, чашчобіна"* у значэнні "густы, цяжкапраходны лес; зараснікі кустоўя". Вёска ляжыць на ўскрайку вялікай Варапаеўскай лясной дачы і ў пачатку асваення гэтай тэрыторыі людзьмі ўяўляла, напэўна, дрымучы гушчар.

Чашун*ы* – вёска за 19 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 11 км на паўднёвы захад ад Белек на правым беразе ракі Паловіца. Назва паходзіць ад прозвішча-мянушкі *Чашун*, якая ўтварылася ад славянскага дзеяслова *"часацца"* – "скрэбсціся". Прозвішча *Чашун* шырока распаўсюджана на Пастаўшчыне. Мясцовае паданне тлумачыць назву тым, што мясцовыя жыхары вызначаліся ўмельствам добра часаць (абчэсваць) бярвенне, на чым і зараблялі сабе на жыццё.

Ч*о*панішкі – вёска за 35 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5 км на поўнач ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, належала Юрыю Бішэўскаму. Верагодна, назва паходзіць ад асновы *"чоп", "чопка"*, што ў фіна-ўгорскіх мовах азначае "ўпадзіна", "глыбокая даліна". У беларускай мове ёсць слова

"чоп" у значэнні "чан для вады". Сустракаецца і дзеяслоў *"чопкацца"* – "ісці па гразі, па балоце". Як бачна, усе тлумачэнні зводзяцца да таго, што аснова "чоп" абазначае паглыбленне, нізіну. Сапраўды, вёска знаходзіцца ў лагчыне паміж узгоркамі.

Ч*о*рнае – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на ўсход ад Варапаева на ўсходнім беразе возера Чорнае. У 1781 годзе ўваходзіла ў маёнтак Дунілавічы Ашмянскага павета. Назва вёскі паходзіць ад наймення возера, якое атрымала сваю назву за адметны чорны колер вады. Гэты колер стаў асновай і шматлікіх прозвішчаў на Пастаўшчыне: *Чорны, Чарневіч, Чарненка, Чэрнік, Чарноў, Чарных, Чарнюк, Чарняўскі, Чарняк.*

Чырв*о*ны Руч*а*й – вёска за 27 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 14 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў каля ракі Чырвоны Ручай. Назва вёскі паходзіць ад наймення ракі, якая выдзяляецца сваім чырванаватым колерам з прычыны прысутнасці ў вадзе "аржавіння" – злучэнняў *жалеза*.

Чыч*э*лі – вёска за 16 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы захад ад Камаяў. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Чычаль*, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі. Па Фасмеру, *чычаль – голы чалавек*. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішча *Чычаль*.

Ш

Шабан*ы* – вёска за 10 км на поўдзень ад Паставаў на заходнім беразе возера Доўжа. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча Шабан, якое, верагодна, утварылася ад беларускага *"шабуня"*, што азначае "жартаўнік, манюка". Пісьменнік У. Ліпскі тлумачыць паходжанне прозвішча ад "шабан" – восьмы месяц у мусульманскім календары. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Шабан, Шабацін, Шабовіч.

Шкірал*і* – вёска за 8,5 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на ўсход аж Камаяў. Назва паходзіць ад літоўскага імя *"Skireikis"*, якое ўтворана ад дзеяслова *"skirti"*,

што азначае *"аддзяляць"*. Слова *"шкіралі"* магло мець значэнне *"выселкі"*.

Ш*у*даўцы – вёска за 32 км на захад ад Паставаў, за 2 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. Вядома з 1790 года. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, належала Бішэўскаму. Назва паходзіць ад літоўскага «ðûdas» – "непатрэбшчына, друхлядзь" (Л).

Ш*у*рпікі – вёска за 3 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча *Шурпік*, якое ўтворана ад *"шурпа"*, што азначае *"кучаравы"* (Б, Н). На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Шурпік, Шурпіцкі*.

Шусц*і*цкія – вёска за 15 км на поўдзень ад Паставаў, за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад Вярэнек. Назва паходзіць ад прозвішча *Шусціцкі*, якое ўтварылася ад старажытнаславянскага *"шуст"*, што азначае "ілжэц, манюка" (Б, Н). На Пастаўшчыне ёсць прозвішча *Шусціцкі*.

Шч*э*рбішкі – вёска за 26 км на захад ад Паставаў, за 7 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча або мянушкі *Шчэрба*, якое ўтварылася ад прыметніка *"шчарбаты"* – *"той, хто мае не ўсе зубы, рэдкія зубы"* (ТСБМ). У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Шчэрба, Шчэрбік, Шчарбіцкі, Шчарбовіч.*

Шылыв*а*тае – вёска за 17,5 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўночны захад ад Варапаева. У пачатку ХХ стагоддзя была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе – урочышча барона Клейгельса Шылаваты Камень. Назва паходзіць ад прыметніка *"шылаваты"*, што азначае *"востраканцовы"*.

Шымук*о*ўшчына - вёска за 26 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўднёвы захад ад Белек на правым беразе ракі Паловіца. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад прозвішча або імя *Шымук*, якое

ўтварылася ад кананічнага каталіцкага імя *Шыман (Сіман)*, што азначае з яўрэйскай мовы *"паслухмяны"*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Шымук, Шымковіч, Шыман, Шымчык.*

Шын*а*ўшчына – вёска за 12 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 3 км на поўнач ад Груздава. Назва, верагодна, паходзіць ад дзеяслова *"шанаваць"*, што азначае "берагчы, паважаць". Магчыма, назва звязана з капліцай, якая там знаходзіцца. На Пастаўшчыне ёсць прозвішчы *Шынаеў, Шынкевіч*.

Ш*ы*ркі – вёска за 5 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 0,5 км на ўсход ад возера Споры. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Шырко*, якое ўтварылася ад прыметніка *"шырокі"*. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Шырко, Шырэй, Шырокі, Шырчанка.*

Ю

Юзафін*о*паль – вёска за 17 км на захад ад Паставаў, за 8 км на поўнач ад Камаяў. Назва складаецца з двух частак. Першая паходзіць ад імя *Юзаф* – формы кананічнага праваслаўнага і каталіцкага імя Іосіф. Другая азначае раллю, палеткі. Такім чынам, назва ўрочышча мела значэнне *"Юзафінава поле".*

***Ю*нькі** – вёска за 5 км на ўсход ад Паставаў на правым беразе ракі Лучайка. Вядома з 1630 года як вёска ў Пастаўскім маёнтку. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад імя *Юнь (Юнька)*, якое з'яўляецца формай кананічнага хрысціянскага Юній.

***Ю*хнава** – вёска за 11 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўднёвы ўсход ад Савічаў. Назва паходзіць ад прозвішча або імя *Юхно*, якое з'яўляецца формай кананічнага імя Яўфімій. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Юхно, Юхневіч*.

***Ю*шкаўшчына** – вёска за 11,5 км на поўдзень ад Паставаў, за 2,5 км на поўнач ад Вярэнек. Назва паходзіць ад імя *Юшка*, якое з'яўляецца формай кананічнага імя *Яўфімій*.

У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Юшко, Юшкевіч*.

Я

Яз*ы* – вёска за 11 км на поўдзень ад г. Паставы, на заходнім беразе возера Доўжа. Зараз злілася з вёскай Параскі. Назва паходзіць ад славянскай асновы *яз* – "загароджа, запруда на рацэ". Праз вёску сапраўды працякая невялікая рэчка, якая ўпадае ў возера.

Па версі мясцовых жыхароў, назва ўтварылася ад наймення рыбы *язь*, якая вясной ў вялікай колькасці раней ішла на нераст у рэчку.

*Я***кавічы** – вёска за 15 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3 км на захад ад Вярэнек. Назва паходзіць ад прозвішча *Якавіч*, якое ўтварылася ад імя *Якаў* – формы кананічнага праваслаўнага імя Иаков. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Якавенчук*, *Якавіцкі, Якаўлеў*.

Як*і***маўцы** – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 12 км на поўнач ад Варапаева ў сутоках рэк Ласіца і Галбяіца. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад імя *Якім (Акім)* – формы кананічнага праваслаўнага імя Иоаким. На Пастаўшчыне вельмі пашырана прозвішча *Якімовіч*.

Ял*о***вікі** – вёска за 30 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 10 км на паўночны ўсход ад Варапаева на правым беразе ракі Ласіца. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Яловік,* якое магло ўтварыцца рознымі шляхамі: або ад беларускага прыметніка *"яловы"* – "які мае адносіны да елкі", або ад мянушкі *"ялавы"* – "бясплодны". На Пастаўшчыне ёсць прозвішчы *Яловік, Яльчык*.

Ян*а***нішкі** – вёска за 33 км на захад ад Паставаў, за 6 км на поўнач ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад імя *Янаній (Ананій)*, якое ўтворана ад кананічнага Ананія, што значыць "дар Божы", "Боская ласка". Ад гэтага імя на Пастаўшчыне пайшлі назвы *Ананіч, Ананкін, Ананьеў*, *Янэль.*

***Я*нкішкі** – вёска за 19 км на захад ад Паставаў, за 8 км на паўночны захад ад Камаяў на паўночным беразе возера Янкішскага. Назва мае тыпова літоўскі канчатак, аднак у аснове яе знаходзіцца фіна-ўгорскі корань: *"янк"* (манс.) – "балота". Такім чынам, Янкішкі – "забалочанае возера", а ад назвы возера пайшла назва вёскі.

Янк*о*вічы – вёска за 15 км на захад ад Паставаў, за 2 км на поўдзень ад Гадуцішак. Назва паходзіць ад прозвішча *Янковіч*, якое ўтварылася ад імя *Янка* – формы кананічнага польскага Jan, кананічнага праваслаўнага Иоанн. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Янковіч, Янкоўскі*.

Янчук*і* – вёска за 37 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўднёвы ўсход ад Дунілавічаў. У 1873 годзе была ў Ваўкалацкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Янчук*, якое ўтварылася ад імя *Янка* – формы кананічнага польскага Jan, кананічнага праваслаўнага Иоанн. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Янчуковіч, Янчанка.*

Ярын*о*ва (Ерын*о*ва)– хутар за 16 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 3 км на поўдзень ад Камаяў. Назва паходзіць ад наймення ўрочышча, дзе было поле. *"Ярына"* – гэта аднагадовая сельскагаспадарчая культура, якая высяваецца вясной і дае ўраджай восенню гэтага ж года.

Яр*э*ва – вёска за 9 км на паўночны захад ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Гадуцішак. Вядома з канца XIX ст. як фальварак Юрэва (Яржэва), названы ад імя уладальніка Юрыя Друцкага-Любецкага.

***Я*сева** – вёска за 15 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 11 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. Назва паходзіць ад імя *Ясь* - формы кананічнага польскага Jan, кананічнага праваслаўнага Иоанн.

***Я*ськавічы** – вёска за 16 км на поўдзень ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад возера Нарач. Назва паходзіць ад прозвішча *Яськовіч*, якое ўтварылася ад імя *Ясь* - формы кананічнага польскага Jan, кананічнага праваслаўнага Иоанн. На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Ясюкевіч, Ясюковіч*.

Ясюк*і* – вёска за 25 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км

на ўсход ад Варапаева на беразе возера Ясюкі. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад імя *Ясь (Ясюк)* - формы кананічнага польскага Jan, кананічнага праваслаўнага Иоанн. У Пастаўскім раёне пашыраны прозвішчы *Ясюковіч, Ясюкевіч, Ясюнас, Ясюлянец.*

Яўнелішкі – вёска за 31 км на захад ад Паставаў, за 4,5 км на паўночны ўсход ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, належала Бішэўскаму. Назва паходзіць з балцкіх моў, дзе літоўскае *"jaunas"* азначае "малады".

Яцавічы – вёска за 8 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 0,5 км на захад ад возера Світа. Назва паходзіць ад прозвішча *Яцавіч (Яцэвіч)*, якое ўтварылася ад польскага імя *Яцэк (Jacek)*. У Пастаўским раёне сустракаюцца прозвішчы *Яцэвіч, Яцкевіч, Яцэнка, Яцына.*

АСНОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ

1. Байкоў М. Я., Некрашэвіч С. М. Беларуска-расійскі слоўнік. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 360 с.
2. Бірыла М. В. Беларуская антрапанімія. – Мн.: Навука і тэхніка, 1982. – 320 с.
3. Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн.: изд. БГУ, 1974. – 448 с.
4. Ліпскі У. С. Мы: Аповесць пра нашы прозвішчы. – Мн.: Беларусь, 2006. – 262 с.
5. Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 328 с.
6. Мурзаев Э.М. Словарь народных географических терминов. – М.: Мысль, 1984. – 653 с., ил.
7. Памяць: гіст.-дакум. хроніка. Пастаўскі раён. – Мн.: БЕЛТА, 2001. – 688 с., іл.
8. Пракаповіч І. М. Чароўны край – Пастаўшчына. – Мн.: "Кнігазбор", 2009. – 304 с.: іл.
9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, т.1-5. – Мн.: БелСЭ – 1977-1984.

У працы выкарыстоўваліся перакладчыкі з літоўскай, латышскай, эстонскай, фінскай, польскай, украінскай моў, а таксама слоўнікі (Даля, Ажэгава, Фасмера і інш.) з розных інтэрнэт-рэсурсаў.

Айканімічны слоўнік

Пракаповіч Ігар Міхайлавіч

Н А З В Ы   Н А Ш Ы Х   В Ё С А К

Рэдактар *Тамара Захарэвіч*

Вёрстка *Ігар Пракаповіч*

Адказны за выданне *Міхал Гіль*

Наклад 80 асобнікаў

Пастаўская раённая арганізацыя
Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны